...ная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ПВК і СНК БССР

ЛІСТАПАД 28 1933 г. АУТОРАК № 262 (4806)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Удзельнікам Усебеларускага комсамольскага-маладзёжнага злёта ўдарнікаў абароны —палкае большэвіцкае прывітанне!

МНОЖЫЦЬ РАДЫ ЎДАРНІКАЎ АБАРОНЫ

Сёння ў Доме культуры адкрываецца скліканы ЦК ЛКСМБ усебеларускі маладзёжна-комсамольскі злёт ударнікаў абароны.

400 делегатаў ад комсамольскіх арганізацый, прадстаўнікі ад падшэфных комсамолу чырвоных пагранічнікаў, мота-механізаваных часцей РСЧА, асоавіяхіма, аўтадора і чырвонага крыжа прадставяць па злёце многія сотні тысяч выхаваных комсамолам пад кіраўніцтвам партыі энтузіястаў соцыялістычнага будаўніцтва, актыўных змагароў за ўмацаванне абароназдольнасці краіны.

У святле задач, выцякаючых з сучаснага міжнароднага і ўнутранага становішча СССР, маладзёжна-комсамольскі злёт ударнікаў абароны з'яўляецца надзвычай важным момантам у справе далейшага ўмацнення абаронай работы комсамольскай арганізацыі прымежнай рэспублікі БССР — фарпоста Совецкага Саюза.

Сучаснае міжнароднае становішча характарызуецца паглыбленнем і абвастрэннем сусветна-эканамічнага крызіса, абвастрэннем супярэчнасцяй у лагеры імперыялістаў, умацаваннем агрэсіўнасці і правакацый супроць СССР па Далёкім Усходзе—з аднаго боку і далейшым **умацаваннем міжнароднага аўтарытэта Совецкага Саюза**—з другога.

Надаўняе заключэнне намі з радам прымежных буйнейшых еўрапейскіх капіталістычных краін пактаў аб вызначэнні агрэсара (нападаючага боку) і асабліва ўстанаўленне з намі нармальных дыпламатычных адносін буйнейшай капіталістычнай краінай ПАЗШ—найбольш яркае адлюстраванне ўсё ўзрастаючага міжнароднага аўтарытэта СССР. Дасягнутая згода паміж ПАЗШ і СССР з'яўляецца найвялікшай перамогай мірнай палітыкі Совецкага Саюза, буйнейшым фактарам гістарычнага значэння.

Совецкі Саюз быў, ёсць і застаецца несакрушальным аплотам міра. Мір нам патрэбен для творчай работы, для далейшага роста вытворчых сіл, для далейшага росквіту краіны пабудовы бяскласавага соцыялістычнага грамадства.

Усё нагнятаючыяся жаночмічны крызіс у краінах капітала, нарастанне супярэчнасцяй у імперыялістычным лагеры штурхае збанкрутаваных запраўдных капіталістычнага света на новыя авантуры і правакацыі. Яны імкнуцца знайсці выхад з сучаснага становішча ў нападзе на СССР. Доказам такіх імкненняў з'яўляюцца розныя антысовецкія камбінацыі германскіх фашыстаў, ангельскіх цвёрдалобых і правакацыі японскага імперыялізма на Далёкім Усходзе. Нельга ні на мінуту забывацца, што вагнная небяспека актуальна. Для адпора магчымага нападу трэба быць гатовым ва ўсеўзбраенні.

Дасягнутыя, пад кіраўніцтвам геніяльнага правадыра партыі тав. **Сталіна**, поспехі соцыялістычнага будаўніцтва, ператварэнне Совецкага Саюза ў перадавую індустрыяльную краіну падвялі магутную базу для насычэння нашай Чырвонай арміі тэхнікай усіх родаў зброі сучаснага боя, забяспечылі ўзнікненне не баявой магутнасці на небывалую вышыню.

Верны вартавы кастрычніцкіх завае цвёрда стаіць на ахове недатыкальнасці совецкіх межаў.

Справа абароны краіны—справа ўсіх працоўных. Таму кожны працоўны Совецкага Саюза павінен аўладаць неабходнымі вайсковымі ведамі. Выключна вялікая роля ў развіцці гэтай справы належыць комсамолу. Работа ячэек асоавіяхіма павінна стаяць у цэнтры ўвагі комсамольскіх арганізацый. У адпаведнасці з пастановай IX з'езда УсеЛКСМ кожны комсамолец да арміі праходзіць усеагульнае вайсковае навучанне. Гэтае навучанне павін на даць не толькі аўладанне ў асновах механізмам сучаснай зброі, ведамі хіміі і процішаветранай абароны, але вызначыць ясна акрэслены профіль у галіне той ці іншай спецыялізацыі.

Дрэнна, калі некаторыя комсамольскія арганізацыі ў правядзенні ўсенавучэння замыкаюцца толькі ў саюзных рамках. Ваенізацыя ўсёй прапоўнай моладзі шляхам уцягнення ў гурткі вайсковых ведаў, стралковыя гурткі і г. д. павінна быць сустаўной, важнейшай часткай работы комсамольскіх арганізацый у сістэме падрыхтоўкі рэзерваў для часцей РСЧА.

Справа гонару кожнай комсамольскай арганізацыі—настойліва дабіваецца ажыццяўлення лозунга: кожны ўдарнік на вытворчасці—ударнік абаронай работы.

Кожны мой таварыш—гэта той,
Хто агні запальвае ў домнах,
Поўны сілы юнай, баявой,
Ён працуе хутка і вистомна
Кожны мой таварыш—гэта той,
Хто сягоння загарэлы, свежы,
Выйшчае з трактарнай сям'ёй—
Узрываць на буйным полі межы.
Кожны мой таварыш—гэта той,
Хто на варце дзён вясновa-светлых.
Хто гатоў заўсёды выйсці ў бой
Бараніць рэспубліку Совецкую.

Гатовым бараніць рэспубліку Совецкую можа лічыцца толькі той працоўны, які мае вайсковую падрыхтоўку.

Дык будзем жа кожны крок сваёй дзейнасці на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва спалучаць з задачамі аўладання вайсковымі ведамі, з задачамі ўзмацнення баяздольнасці нашай краіны.

Хай памятуюць авантурысты з імперыялістычнага лагера, што на тэрыторыі краіны Совецкай ім не давядзецца весці вайну. На спробы нападу інтэрвенцыяністы нашла слаўная непераможная Чырвоная армія пры ўсеагульным кадтрымані працоўных адкажа знішчальным разгромам ворага на яго-ж тэрыторыі.

РАЗГАРНУЦЬ САМУЮ РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ З КУЛАЦКІМ САБАТАЖАМ ІЛЬНАЗАГАТОВАК

ЧЫМ ВЫШЭЙ ЯКАСЦЬ ІЛЬНУ, ТЫМ БОЛЬШ ДАХОД КАЛГАСНІКА

АБ АПРАЦОЎЦЫ І ЗАГАТОЎЦЫ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР, ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б і палітсектара НКЗБ

СНК БССР, ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б і палітсектар НКЗБ канстатуюць, што рад канкрэтных дырэктыў ЦК і СНК аб арганізацыі своячасовай апрацоўкі і загатоўкі ільну і канапель ні зямельнымі, ні загатоўчымі органамі, ні РК, РВК і палітаддзелам МТС не выкананы. Не гледзячы на тое, што ўсе тэрміны ўборкі, расцёпу (замочкі) і падёма ільну і канапель даўно прайшлі, па дзеных НКЗ на 20 лістапада не закончан падём ільну са сцеліішчаў. Канапель убрана толькі 91,1 проц., замочана 69,1 проц. і вымута з мочкі толькі 30,9 проц.

На 20 лістапада план загатовак выкананы: па ільнасемі на 80,3 проц., ільнавалакну сялянскай апрацоўкі на 9,4 проц., ільнатрасце—27,1 проц. (у пераводзе на валакно ўсяго на 17,3 проц.), канаплях—69,8 проц. і пяньцы—3,7 проц. Устаноўленыя СНК і ЦК тэрміны скончэння загатовак сарваны па насенню ільну і канапель, па ільнатрасце і знаходзяцца пад простай пагрозай зрыва па ільнавалакну і пяньцы.

З усіх раёнаў толькі ДРЫСЕНСКІ, СЕННЕНСКІ, ПОЛАЦКІ І ЛОЕЎСКІ паказваюць узоры большэвіцкай барацьбы за своячасовае выкананне плана ільназагатовак як па колькасці, так і па якасці. Большасць-жа раёнаў, пра вальваючы загатоўкі ільну, асабліва сялянскай апрацоўкі, па колькасці, не вядуць ніякай работы па ўзнаўленню яго якасці, у разультаце чаго пры плановым № 8 і абавязацельствах, узятых радам раёнаў па загатоўцы ільну сярэднім № 10, — фактычная загатоўка ідзе ў сярэднім № 7, 6. Пры гэтым некаторыя раёны (Асвея, Дуброўна, Дрыса), перавыконваючы якасныя заданні па трасце, не вядуць рашучай барацьбы за павышэнне якасці ільну сялянскай апрацоўкі і дапускаюць значнае зніжэнне яго нумара.

Такое становішча з ільна-пеньказагатоўкамі сведчыць аб тым, што РК, РВК, РКК і палітаддзелы МТС недаацэнілі важнейшага гаспадарча-палітычнага значэння гэтых загатовак, не здолелі спалучыць ільнопеньказагатоўкі з іншымі сельска-гаспадарчымі кампаніямі, забылі ўрокі леташняй ільназагатоўчай кампаніі, памяліліся на самацёк, не здолелі спалучыць метады пераканання і масава-палітычнай работы з метадамі прымусу па выкананню кантрактантам абавязацельстваў перад дзяржавай і, непераканаўшы простым указаннем СНК і ЦК аб адказнасці іх за загатоўкі ільну і канапель,—перакінулі гэту адказнасць цалкам толькі на слабыя апараты Загатільна і спажыўкааперацыі.

ЦК, ЦКК КП(б)Б, СНК БССР І ПАЛІТСЕКТАР ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Яшчэ раз папярэдзіць усіх сакратароў РК, старшынь РВК, старшынь РКК, дырэктароў і начальнікаў палітаддзелаў МТС у першую чаргу ЧАВУСКАГА, ГОРАЦКАГА, КРУПСКАГА, БЯЛЫНІЦКАГА, ЛЕПЕЛЬСКАГА, ЧЫРВОНАПОЛЬСКАГА, БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА і ЧАЧЭРСКАГА раёнаў, што калі ў бліжэйшыя-ж дні не будзе падняты і звезен з поля ўвесь разасланы лён і закончана ўборка і замочка канапель, не будзе закончана поўнасцю загатоўка насення ільну і канапель, і не будзе забяспечан рэзіф перагон у загатоўках ільнаволакна і пяньковага валакна і трасты, — СНК, ЦК і ЦКК вымушаны будуць прымяняць да іх самыя суровыя меры спагнання.

2. Абавязаць РК, РВК і нач. палітаддзелаў МТС з 27 лістапада ўстанавіць штодзённыя заданні для калгасаў, МТС і сельсоветаў, а апошнім — для іншых калгасаў і аднаасобнікаў па апрацоўцы і здачы прадукцыі ільну і канапель, і штодзённа-ж правяраць іх выкананне.

3. Абавязаць РК, РВК і палітаддзелы МТС у сутачны тэрмін прымацаваць да сельсоветаў і калгасаў адказных работнікаў раённага актыву выключна для работы па ўзмацненню апрацоўкі і загатоўкі ільну і канапель, забяспечыўшы ім зваротаў райцэнтр аж да выканання гадавых планаў загатоўкі.

Спыніць скіданне ўсякага рода нарад і канферэнцый па ільну і канаплях; усю масава-растлумачальную і арганізацыйную работу перанесці непасрэдна ў месцы першапачатковай апрацоўкі ільну і канапель — у калгасныя звенні, да сушкі, мяцця і трапання. Адначасова разгарнуць самую рашучую барацьбу з кулацкім сабатажам ільна-пеньказагатовак, ужываючы жорсткія меры ўздзеяння да недобрасумленных здатчыкаў, сабатуючых здачу ільну і канапель дзяржаве і кантрактацыйныя дагаворы. Пракурору рэспублікі па сваёй лініі даць адпаведныя указанні і забяспечыць нечарговы разгляд такіх спраў.

4. Для дапамогі раёнам і ўзмацнення апрацоўкі і загатоўкі ільну і канапель камандыраваць у якасці ўпаўнаважаных СНК і ЦК 44 работнікаў. Указаць гэтым таварышам, што іх выезд з раёнаў можа быць дазволен толькі пасля выканання гадавых планаў загатоўкі ільну і канапель.

5. Ускласці на чацвёрку ў складзе т. т. ШАРАНГОВІЧА, ГАЛАДЗЕДА, СААКЯНА І РАТНЕКА непасрэдна кіраўніцтва ад імя ЦК і СНК работай РК, РВК і палітаддзелаў МТС па рэалізацыі і праверцы выканання гэтай пастановы і, у прыватнасці, устанаўленне сістэматычнай сувязі з раёнамі і ўпаўнаважанымі СНК і ЦК. У апараце Упаўкамзаг СНК выпучыць тав. КРАСОЎСКАГА спецыяльна для работы па ільнапеньказагатоўках, вызваліўшы яго на час ільнапеньказагатовак ад усякай іншай работы.

6. У адпаведнасці з планам Камзаг, СНК СССР дазволіць загатоўку ільну сырца ў колькасці 2.000 тон сярэднім № 5 у кошт агульнага плана загатоўкі ільнасемяння. Прапанаваць Упаўкамзаг СНК і Загатільну размеркаваць гэту колькасць па раёнах, улічваючы, што загатоўка сырца можа быць дапушчана толькі ў старых сырцовых раёнах, пры абсалютнай немагчымасці здачы трапанага валакна.

Адначасова з гэтым спыніць маючыя месца выпадкі адмаўлення ад прыёмкі чыста-страпанага ільну нізкіх нумароў, предугледжаных стандартам.

7. Указаць РК, РВК, РКК і нач. палітаддзелаў МТС, што ўстаноўленыя для раёнаў план загатоўкі ільну будзе лічыцца выкананым толькі ў тым выпадку, калі будуць поўнасцю выкананы заданні як па валакну сялянскай апрацоўкі, так і па трасце. Перавыкананне плана па трасце за кошт недавыканання плана па ручной апрацоўцы дапушчана быць не можа.

Прыхаючы зусім направільнымі навукі ў асобных раёнах тэндэнцыі неўрэгулятаванага скарачэння здачы трасты на заводы, у той-жа час катагарычна забараніць прыёмку заводамі трасты звыш плана як па заводу ў цэлым, так і ад асобных здатчыкаў.

У адпаведнасці з планам Камзаг СНК СССР і пастановай СНК і ЦК ад 4 верасня ўстанавіць для прыёмкі зводамі сярэдніх нумары турбінай трасты—1,55 і кудзельнай—0,75, уводзячы гэтыя нумары на ўсю прыёмку трасты заводамі, і ў гэтай частцы змяніць пастанову СНК і ЦК ад 11 лістапада г. г.

Выходзячы з абавязковасці для загатоўшчыкаў і здатчыка кантрактацыйных дагавораў, устанавіць наступнае размеркаванне загатаўляемай трасты па відах: турбінай—70 проц. і кудзельнай—30 проц.

Абавязаць РК, РВК, Загатлён і дырэктараў заводаў шырока паведаміць здатчыкаў, што як устаноўленыя нумары і процанты па трасце, так і ўстаноўленыя для раёна і здатчыка сярэдні нумар валакна сялянскай апрацоўкі выконваецца і забяспечана поўнае выкананне плана па валакну ў тона-нумарах. Катэгарычна забараніць павышэнне нумароў па трасце за кошт зніжэння нумароў па валакну сялянскай апрацоўкі.

8. Даручыць райКК-РСІ ўключыцца ў барацьбу за своячасовае скончэнне ільна-пеньказагатовак і забяспечыць сістэматычны кантроль за своячасовым і поўным выкананнем гэтай пастановы.

Старшыня СНК БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар ЦК КП(б)Б
ШАРАНГОВІЧ.

Старшыня ЦКК-НК РСІ БССР
ЛЫЧОЎ.

Нам. нач. палітсектара НКЗ БССР
КУШНАРЭНКА.

Ход спаборніцтва паміж БССР і Заходняй вобласцю

Загатоўлена ільнапрадукцыі ў процантах на 20 лістапада:

	БССР	Заходняя вобласць
Ільнасемя	80.3	87,7
Ільнавалакно	17,3	15,2
Канапель	69.8	82,0
Пянькі	3.3	1,0

САКРЭТ У ДБАЙНАЙ ПРАЦОЎЦЫ

Я трапальшчыцай ужо не першы год. Але гэты год мне налоўга запомніцца. Сёлета наша брыгада працавала як ніколі за ўвесь час існавання калгаса.

Часта ў мяне суседзі-калгаснікі і аднаасобнікі пытаюць:

— Чаму гэта, Ульяна, у вас добрае ільнавалакно? Што за сакрэт?

І потым гэты-ж самы чалавек пера котваецца, што ўвесь сакрэт у добрай і дбайнай апрацоўцы гэтай каштоўнай культуры.

Мая норма 4 кіло. Але я не памятаю такога выпадку, каб не натрапала менш 6-ці кіло ў дзень. Пільна сачу і за якасцю трапання, выбіваю да ацэнкі кастрыцы, хутка сартую валакно і не дапускаю, каб яно блыталася.

Хвалёнца не буду, за ўвесь час работы майго валакна ніколі не пераробляхі. Валакно, якое я натрапала, нашло не нікэй 11-12 нумара, на трапаній я выпрацавала 21 працадзень, а ўсяго маю 170 працадзён—больш чым усе жанчыны 4-й брыгады. Я гаварыся тым, што мяне ў калгасе называюць ударніцай.

Я ведаю, што за добрасумленную работу ў калгасе я атрымаю добры ўраджай. Апрача 140 пудоў бульбы, 50 пудоў збожжа і грошай яшчэ дадаткова атрымаю хлеб, масла і грошы за трапанне ільну. Спадзяюся, што змагу прадаваць дзяржаве лішкі хлеба і абавязкова ў гэтым годзе пашыю сабе суконку і куплю новыя чаравікі.

Абавязуюся ў будучым годзе даць ільнавалакно 18-га нумара.

Трапальшчыца ЛАПЕНКА УЛЬЯНА.
Калгас імя Сталіна, Полаччына.

АДНААСОБНІК ЗКІНУТ З РАХУНКА

ЛЁЗНА. (Ад наш. спецкарэспандэнта).

Акуратныя людзі ў лёзненскім райземаддзеле. Акуратныя наконт папер. У гэтым іх папражнуць пельга. Вялікі аркуш паперы чысценька запоўнен ад верху да ніву лічбамі ў разрэзе сельсоветаў, а калі хочаце дык і калгасаў:

Драўляных простых мялак у калгасах 484 шт., 2-хпарвальных — 36, 3-хпарвальных — 44, 6-цішарвальных—31, а разам—595 шт. Пункт таў па першапачатковай апрацоўцы ільну—657.

Караней кажучы, мялак і сушылень у раёне дастаткова, каб на працягу максімум паўмесяца пераапрацаваць і здаць дзяржаве 2105 цэнтн. валакна па калгасах і 4058 цэнтн. па аднаасобнаму сектару.

595 мялак за адзін дзень пры добрасумленнай працы на іх могуць даць не менш 600 цэнтн. валакна. Гэта толькі па калгасах. Столькі-ж можа даць і аднаасобны сектар.

А што яны даюць? Паглядзімо на сводку. Калгасы раёна на 10 лістапада здалі ўсяго 206 цэнтн. валакна, або кала 9 проц. гадавога плана. Гэтую колькасць можна было пераапрацаваць улічваючы наяўнасць інвентара, максімум за... паўдня.

Яшчэ горш у аднаасобным сектары. На 10 лістапада здана дзяржаве толькі 99 цэнтн. або... 2,4 проц. гадавога плана.

Такіх ганебных тэмпаў Лёзненскі раён не ведаў ніколі.

У чым-жа справа? Чаму так недаступнала адстала Лёзна?

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове выразна ўказаў, што лёзненскі РК КП(б)Б, фармальна ўключыўшыся ў сталінскую ільнаэстафету, абмежаваў ся вышэйшым дэкларацыйных пастаноў, не прыняўшы ніякіх канкрэтных мер для іх выканання.

І сапраўды. Яшчэ ў сакавіку аб'яднаны пленум РК КП(б)Б і РКК вынес урачыстую пастанову «зрабіць раён узорным па ільну».

Але прыгожыя гучныя пастановы РК, РКК КП(б)Б і РВК аказаліся пустымі дэкларацыямі, бо яны не былі падмацаваны большэвіцкімі справамі.

І прывядзены з пачатку прыклад з уліках ільна-мяльнага інвентара—гэта таксама паказальнік таго, што ўлік робіцца для адвода вачэй. А справа ідзе самацёкам. Ніхто ў гэты спіс не заглядае, ніхто ім не кіруецца, ніхто ў раёне па-большэвіцку, дзельна і канкрэтна арганізацыйна пераапрацоўкі ільну не займаецца.

Што гэта так, пакажам на некалькіх прыкладах. У калгасе «Праўда», Вунаўскага сельсовета, 6-ці парвальная чытунная мялка бязвейнічае, у калгасе імя Варашылава, Крынкаўскага сельсовета—таксама. У калгасе «Прагрэс», Глодзенскага сельсовета, стаяць без работы 2 складаных 6-ці парвальныя мялкі. У калгасе «Авангард», Калышанскага сельсовета, могуць працаваць 8 пунктаў, а працуе толькі 2. Такія прыклады можна ў многа раз катэгарычаць.

А чаму так? Таму, што ў раённых арганізацыях выносяць агульныя пастановы: «узмацніць», «павысіць тэмпы», «узняць якасць», у партячэйках і сельсоветах штампуюць гэтыя пастановы, а ў калгас, брыгаду, звяно па пераапрацоўцы ільну не ідуць для канкрэтнай арганізацыйнай і масава-палітычнай работы.

Зразумела, гэтым карыстаецца кулак, падкулачнік, гультай і прагульшчык для сваёй разбуральнай работы на ільнамяльных пунктах.

Якасць ільнавалакна, не гледзячы на дзесятак дэкларацыйных пастаноў, —ніякая, асабліва ка аднаасобнаму сектару. Для таго, каб у гэтым упэўніцца, варта пабываць на загатоўчым пункце. На жаль, сюды толькі выпадкова і мімалётам заходзяць раённыя кіраўнікі, напрыклад, сакратар РК КП(б)Б т. **Міцькоў**, старшыня РВК **Валюкевіч** і інш.

А варта заходзіць часцей і не на мінуту. Тут, па загатоўчым пункце, як у люстры, адбіваецца тое, што робіцца на месцах, у калгасных брыгадах, у аднаасобных дварах.

Вось аднаасобнік в. Саланец Сметашнікаў Е., прывёз 100 кіло валакна, апрацоўка нікудышная. Не вытрапана кастра. Палова ільну варочаецца назад. Трэба ператрапаць.

Аднаасобнік з вёскі Рубяжніца Арцюхаў прывёз вялікі воз ільну. Прынята толькі 21 кіло 4-м нумарам, рошта накіравана назад для ператрапвання.

Трэці, чацверты аднаасобнік пад'яжджае—лён бракуецца. Дрэнна абтропаны, дрэнна падвязаны (падвязваюць цэлымі пайкамі, а не тонкім скруткам з ільну).

Аднаасобнік вёскі Зуі Нахаеў Пракоп прывёз надрэпны лён, добра абтропаны, але штучна памочаны. Прыёмшчык-спецыяліст адразу вызначае фальсіфікацыю, крыўдзіцца, што Нахаеў «абманурыў» лён, але... прымае, тым самым парушае дырэктывы аб барацьбе з фальсіфікатарамі.

Даволі і паўдня пабыць па загатоўчым пункце, каб пераканацца, што сярод аднаасобнікаў зусім ніякай работы па арганізацыі высакаякаснай пераапрацоўкі ільну і здачы яго дзяржаве ў найкарацейшыя тэрміны не вядзецца.

Аднаасобнік скінут з рахунка.

Прывозіць лён калгас «Большэвік», Чарнішкага сельсовета, за ім калгас «Новы шлях», Вунаўскага сельсовета. Валакно ніякай якасці. Прыёмшчык пераглядае і... прымае, аднак, папярэджвае: «Калі наступны раз будзе так дрэнна апрацаваны лён, не прыму». Нумар зразумела—пусты, дзве-тры вязкі ільну лепшых трапальшчыц паладзе ў нумар 8. Вязкі абязлічаны, невядома, хто іх рабіў, бірачак няма, як гэта робіць перадавыя калгасы.

Вось пад'яжджаюць да загатоўнага пункта дзве фурманкі (адна паракотная) з калгаса «Перадавік», Горбаўскага сельсовета: увесь лён бракуецца. У пайках валакна кастра-сыпучка, якую не толькі можна адбіць трапалкай, але нават вытрусіць.

Фурманкі павінны звяртацца назад за 35 кілометраў па дрэнная дарозе. Як не дзіва, у гэтым калгасе быў сам загадчык канторы Загатільна т. Навуменка, але... «не заўважыў» таго, што павінен бачыць у першую чаргу.

Ды што там калгас «Перадавік». Такіх прыкладаў шмат.

— 50 процантаў ільнавалакна звяртаем назад,—гаворыць Навуменка.

— 60 процантаў адпраўляем назад, —гавораць спецыялісты-прыёмшчыкі.

Зусім відавочна, што ў годзе пераапрацоўкі і загатовак ільну ў Лёзненскім раёне не будзе пералома да таго часу, пакуль раённае кіраўніцтва ад агульных, дэкларацыйных пастаноў не перойдзе да канкрэтнай арганізацыі работы ў масах.

Лёзненскія калгаснікі і аднаасобнікі ўмеюць добра апрацоўваць лён. Аб гэтым гаворыць прыклад калгаса «Прафінтэрн», вопыт якога «Звязда» падрабязна паказала на сваіх старонках. Трэба толькі па-большэвіцку арганізаваць масы.

Трэба разгарнуць самую рашучую барацьбу з кулацкім сабатажам ільна-пеньказагатовак, ужываючы жорсткія меры ўздзеяння да недобрасумленных здатчыкаў, сабатуючых здачу ільну і канапель дзяржаве і кантрактацыйныя дагаворы.

А. М.

НОВАЙ ХВАЛЯЙ ЭНТУЗІЯЗМА АДЗНАЧАЮЦЬ РАБОЧЫЯ МЕНСКА ПАСТАНОВУ АБ XVII З'ЕЗДЗЕ ПАРТЫ

Дамо Менску добраякасны хлеб!

Мітынг, прысвечаны паведамленню аб скліканні XVII партз'езда, прайшоў учора на хлебакамбінаце пад знакам барацьбы за жывыя практычныя мерапрыемствы.

— Забяспечыць, нарэшце, пролетарыяў Менска высокаякасным, смачным хлебам, даваць штодня ўсе 180 тон прадукцыі без адзінага кіло брака! Дасканала аўладаць тэхнікай пякарскай справы! Бязжэліва, сапраўды патасандарыску адносіцца да печаў, да ўсяго заводскага абсталявання! — аб гэтых задачах, як бліжэйшых і галоўнейшых, гаварылі ў сваіх выступленнях рабочыя, прадстаўнікі адміністрацыі, ТПР.

— Наша першая брыгада, — заявіў бракер т. [illegible] — абавязваецца давесці выканання 103 проц. дзённага выпуска хлеба. Абавязваемся дзвесці брак да нуля. **Бярэм на прамадскі буксір брыгаду № 3, якая на сёння выканае пакан усяго на 92 проц.**

Лепшым ударнікі хлебазавода — т. т. **Асман, Адзінцоў, Петкевіч, Фішар, Мерэнштайн** напярэдадні XVII з'езда УсеКП(б) абяцалі прыкладасці ўсе свае намаганні ла паспяховае выкананне і перавыкананне праграмы, на дапамогу адстючым цэхам, на перадачу свайго вопыта малодшым таварышам.

Сход, у якім бралі ўдзел рабочыя двух змен, як самога завода, так і механічных пякарань горада, прайшоў з надзвычайным уздымам і свядомасцю. На ім было прынята атульнае абавязацельства рабочых і служачых камбіната па забеспячэнні якасці хлеба, поўным ахопе работнікаў завода соцыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам, па разгортванню тэхнічнай вучобы, павышэнню працоўнай дысцыпліны і інш.

У галіне павышэння абарончай работы сход ухваліў падрыхтаваць 150 класных стралкоў цёра і 50 варашылаўскіх стралкоў, а таксама ліквідаваць малапісьменнасць па супрацьлавітранай абароне сярод усіх рабочых.

ЮР.

Шэсць торфасушылак у падарунак з'езду

Слова аб надыходзячым XVII з'ездзе УсеКП(б) сакратар партканітэта заводу «Комунар» тав. **Кузняцоў** прадстаўляе тав. **Дунцу**. Увагліва слухаюць рабочыя-комунараўцы аб вялізарных экамічных, палітычных і культурных вынніках, з якімі сустракае краіна XVII з'езд.

Першым слова па дакладу просіць рабочы-слесар т. **Грыб**.

— Усіх поспехаў не пералічыць. Шмат іх. Расцем хутка. Вось памяжнець хоць-бы на наш завод, які такім ён быў? Не пазнаць яго. Яшчэ XVI з'езд мы сустракалі з вышускам бетонных варштатаў. Лічылі гэта дасягненнем. А зараз? Для нас гэта ўжо аладеца драбніцай. Да XVII з'езда завод асвойвае складанейшыя імпартныя варштаты: цэнтравальныя і інш. І тав. Грыб, прыводзячы ўражанні пралеглага учора гукавога кіно-фільма «Для вас знойдзецца работа», робіць параўнанні:

— У той час, як там за межамі расце беспрацоўе, голад і галеча, у нас расце вытворчасць, багацце краіны, паляпшаецца дабрабыт рабочых. Усё гэта вынік правільнай палітыкі нашай ленінскай партыі, на чале якой стаіць мудры правадыр тав. **Сталін**.

Гарбарнікі „Большэвіка" абавязаліся

На **гарбарні «Большэвік»** пасля работы адбыўся мітынг рабочых, на якім тав. **Страноўскі** зрабіў даклад аб значэнні надыходзячага XVII з'езда УсеКП(б).

У гонар з'езда **другі хромавы цэх** абавязаўся выканаць план 4-га квартала за 5 дзён да тэрміна. Выпусціць 25 тыс. футаў экспартнага тавара. Ліквідаваць прарыў у зніжэнні сабекошта ў суме 30 тыс. рублёў, дапушчаныя за першыя 9 месяцаў 1933 года. Павысіць прадукцыйнасць працы на 3 проц.

Першы хромавы цэх абавязаўся выканаць прамфінплан у колькасным і цэнасным адзначэнні на 10 дзён раней тэрміна. Прадукцыйнасць працы павысіць на 4 проц. У чадвертым квартале даць 30 тыс. футаў экспарта. Асвоіць выпрацоўку лайкі. Палепшыць якасць апрацоўкі свіных скур.

Узялі на сябе абавязкі і асобныя брыгады. **Чырвонасцяжная брыгада** рамшчыкаў 1-га хромавага цэха абавязалася прыняць актыўны ўдзел у перавыборах партыйных арганізацый. **Унесці не менш 5 рацыяналізатарскіх прапаноў у фонд XVII з'езда партыі.**

Чырвонасцяжная брыгада стругалей 2-га хромавага цэха абавязалася да 1 студзеня 1934 года здаць тэхнічны экзамен усімі рабочымі на «добра».

На гарбарні арганізавана 5 ударных брыгад імя XVII з'езда.

Мінкін.

„АЎЛАДАЕМ ТЭХНІКАЙ НОВЫХ МАШЫН"

Учора на абутковай фабрыцы імя **Катковіча** адбыўся агульна-фабрычны мітынг рабочых, работніц, прысвечаны падрыхтоўцы да XVII з'езда партыі. З дакладам на тэму **«З чым краіна Советаў падыходзіць да з'езда партыі»** выступіў тав. **Дзейдовіч**.

Паоля дакладу выступалі рабочыя, лепшыя ўдарнікі фабрыкі. У сваіх выступленнях яны адзначалі тыя дасягненні, якіх дабілася фабрыка. Адзначалі і недахопы, якія перашкаджаюць у выкананні праграмы. Дзеня цімесячнае вытворчае задание фабрыкай выканана толькі на 89,4 проц., кастрычніцкае — на 94,4 проц.

У першай дэкадзе лістапада крывая выканання расла пайвіна ўніз. Вытворчае заданне было выканана толькі на 79,9 проц. У другой дэкадзе на фабрыцы быў абвешчан масава-вытворчы паход імя тав. **Гікало**. І ўжо другая дэкада дала выкананне праграмы на 113,9 проц. Налепшылася і якасць прадукцыі. Калі ў кастрычніку адхіленне ад першага гатунка на фабрыцы было 31 проц., замест планавых — 10 проц., дык на 26 лістапада яно ласкнула 18 проц.

Рабочыя ўдзельнікі мітынга абавязаліся ў гонар з'езда партыі выканаць прамфінплан па ўсіх яго паказальніках на 10 дзён раней тэрміна.

У сваіх выступленнях рабочыя адзначалі, што яны ў першай пяцігодцы пабудавалі новы канвеер і пачалі ўстанавілі новыя штампаваныя ў закройным цэху.

— Я абавязуюся аўладаць тэхнікай гэтых машын, — гаворыць брыгадзір машыннага цэха **Вінакураў**—мая брыгада таксама абавязалася акуратна паведваць гурткі па ліквідацыі тэхнічнасьменнасці.

Аналагічныя абавязацельствы ўзялі на сябе і рабочыя-ўдарнікі т. т. **Нісневіч, Гэдуд, Абрамовіч, Шулькін** і інш.

А.

* * *

На заводзе імя **Молатава** адбыўся мітынг, прысвечаны пастанове пленума ЦК УсеКП(б) аб скліканні XVII партз'езда.

У гонар з'езда рабочыя завода абавязаліся да 1 студзеня закончыць праграму IV квартала і ліквідаваць заказычанасць дзяржаве за 9 месяцаў у суме 500 тыс. руб. Апрача таго абавязаліся да дня адкрыцця з'езда закончыць студзеньскую праграму 1934 года.

Л.

* * *

У сувязі з паведамленнем ЦК УсеКП(б) аб адкрыцці XVII з'езда партыі на швейнай фабрыцы **«Прафінтэрн»** (Віцебск) учора на ўсіх зменах праводзіліся сходы рабочых, на якіх абгаворваліся практычныя прапановы па ліквідацыі прарыва.

У гонар з'езда па цэху дзіцячых польтаў арганізавана **істужка імя XVII з'езда.** Рабочыя істужкі ўзялі на сябе абавязацельства знізіць брак да 0,17 проц. замест 1 проц.

Арк.

ЗЛЁТУ МАЛАДЫХ ЎДАРНІКАЎ АБАРОННАЙ РАБОТЫ

Лепшым маладым прадстаўнікам рабочых, калгаснікаў — злёту ўдарнікаў абаронай работы ад Совета Народных Камісараў Беларускай ССР шчырае прывітанне!

Таварышы, палітыка ўрада Саюза ССР — гэта песлядоўная палітыка міра.

У гэтай палітыцы наш урад мае гіганцкія поспехі; яны перш за ўсё абумоўлены нашай гаспадарчай палітычнай магутнасцю і магутнасцю нашай рабоча-сялянскай Чырвонай арміі. Дасягнутыя поспехі ў справе міжнароднай палітыкі не азначаюць, што небяспека ваеннага нападу на СССР з боку капіталістаў мінула. Яна — гэта небяспека ўсё больш павялічваецца. Наша задача—ўсямернае ўзмацненне абароны нашай краіны.

У выпадку, калі імперыялісты папрабуюць пашкодзіць нашаму соцыялістычнаму будаўніцтву, — нашай задачай будзе «поўны разгром праціўніка і перамога нашай Чырвонай арміі» (Молатаў).

У будучай нашай барацьбе вы, маладыя прадстаўнікі рабочага класа, ленінскага комуністычнага саюза моладзі, па-ўжыны быць заўсёды гатовы стаць у першыя рады, як і цяпер, у справе ўзмацнення абароназдольнасці нашай краіны.

Вітаючы злёт па падвядзенню вынікаў нашай абаронай работы, жадаю вам, таварышы, яшчэ з большай энергіяй і сілай працягваць яе, дабіваецца яшчэ большых поспехаў. Вы ўсе, як адзін, павінны стаць сапраўднымі варашылаўскімі стралкамі, актыўнымі арганізатарамі працоўных мас на справу ўзмацнення абароны нашага Саюза.

Няхай жыве комуністычная партыя—арганізатар соцыялістычнага будаўніцтва!

Няхай жыве ленінскі чырвонасцяжны комуністычны саюз моладзі!

Няхай жыве праводыр рабочага класа і яго комуністычная партыя т. СТАЛІН.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР ГАЛАДЗЕД.

ВЫНІКІ і БЛІЖЭЙШЫЯ ЗАДАЧЫ ПРАВЯДЗЕННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ НА УКРАІНЕ

(РЭЗАЛЮЦЫЯ АБ'ЯДНАНАГА ПЛЕНУМА ЦК і ЦКК КП(б)У ПА ДАКЛАДУ тав. С. В. КАСІОРА, ПРЫНЯТАЯ 22 ЛІСТАПАДА 1933 ГОДА)

I.

На аснове большэвіцкай індустрыялізацыі і соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, на аснове цвёрдага правядзення генеральнай лініі партыі, бязлітаснай барацьбы супроць апартунізма і нацыяналізма за апошнія гады дасягнуты рашаючыя поспехі ў справе канчатковай ліквідацыі былога каланіяльнага становішча Украіны і звязанай з гэтым становішчам яе культурнай адсталасці.

Магутнае развіццё украінскай металургіі і вугальнай прамысловасці (пабудова новых заводаў і шахт, рэканструкцыя існуючых), стварэнне цэлага раду буйнейшых гігантаў машынабудаўніцтва (Харкаўскі трактарны завод, Краматорскі завод, Луганскі паравозабудаўнічы завод, Харкаўскі турбінны завод і г. д.), рост хімічнай прамысловасці, развіццё лёгкай і харчовай прамысловасці, пабудова буйнейшых электрастанцый (ДнепраДЭС, Штэраўка, Зуеўка) азначала не толькі вялікае павялічэнне прамысловай прадукцыі Украіны, вырашэнне амаль у два з паловай разы за гады першай пяцігодкі. Яна азначала вялізарнейшы якасны зрух у характары і структуры гэтай прамысловасці (механізацыя ў галіне металургіі і вугледабычы, у будаўнічай справе, новая тэхніка машынабудаўніцтва і г. д.). Яна азначала вялізарны рост гарадоў, стварэнне новых прамысловых цэнтраў, вялізарнае пашырэнне старых. Яна азначала ўцягванне ў прамысловую вытворчасць вялізарных мас рабочых з украінскай вёскі, узмацненне ўдзельнай вагі украінцаў у складзе пралетарыята і гарадскога насельніцтва Украіны.

Устанаўленне ў вёсцы калгаснага лада, ліквідацыя кулацкай кабалы, шырокае развіццё МТС і соўгасаў азначала карэнную рэволюцыю ў сельскай гаспадарцы Украіны, не перабудову на соцыялістычных асновах, машынізацыю ўчора яшчэ адсталай і распыленай сельскай гаспадаркі, вялізарны рост яе даходнасці, пачэтак ліквідацыі процілегласці паміж горадам і сялом. Соцыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі азначала таксама далучэнне да культуры, нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу — мільёнаў сялян і рабочых. Пры капіталізме развіццё прамысловасці на Украіне несла за сабой для украінскіх працоўных мас далейшае збяднення, далейшае соцыяльнае і нацыянальнае заняволенне.

Развіццё соцыялістычнай прамысловасці савецкай дзяржавы з'яўляецца асновай магутнага роста соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, асновай соцыяльнага і нацыянальнага вызвалення працоўных украінскіх мас.

Іменна большэвіцкія тэмпы індустрыялізацыі і калектывізацыі, ажыццяўляемай партыяй у бязлітаснай барацьбе з класавым ворагам і яго апартуністычнай агентурай, стварылі моцную базу для небывалага яшчэ ў гісторыі быўшых прыгнечаных народаў роста украінскай савецкай культуры, для пераводу дзяржаўнага апарата на родную мову насельніцтва, для ўмацавання украінскай савецкай дзяржаўнасці. Створана сетка украінскіх школ, у якіх к лету 1933 года налічвалася звыш 4.200 тыс. дзяцей (98 проц. усіх дзяцей школьнага ўзросту украінскай нацыянальнасці). Разгорнута на украінскай мове вялікая кольнасць ВНУ, тэхнікумаў, рабфакаў, у якіх у сучасны момант навучаецца 350 тыс. чалавек, з якіх 3 чвэрці — дзеці рабочых і сялян. Дасягнута небывалае развіццё украінскага друку, навукі, літаратуры, мастацтва. Ажыццёўлена ў асноўным задача пагалоўнай пісьменнасці гарадскога і сельскага насельніцтва Украіны. Магутны гаспадарчы ўздым, у які ўступіла Украіна ў галіне прамысловасці і сельскай гаспадаркі, стварае базэ для далейшага павышэння добрабыта працоўных мас, для магутнага росквіта украінскай савецкай культуры.

Партыя дасягла гэтых вялізарных поспехаў у правядзенні ленінскай нацыянальнай палітыкі на Украіне, сакрушаючы спробу рускіх вялікадзяржаўных шавіністаў, аказваўшых уплыў на пасобных праслойкі партыі, зрываць справу большэвіцкай украінізацыі. Адначасова партыя разграміла спробы украінскіх нацыяналістаў і іх агентуры ўнутры партыі скарыстаць большэвіцкую украінізацыю ў інтарэсах умацавання пазіцый украінскай буржуазіі, адрыва Украіны ад Совецкага саюза, што азначала-б капіталістычную рэстаўрацыю.

У 1926-28 гадах комуністычная партыя Украіны выкрыла антыпартыйную групу Шумскага, якая прыкрывала комуністычнай фразеалогіяй свае буржуазна-рэстаўратарскія імкненні, ажыццяўляючы на справе дырэктывы замежных імперыялістаў, якія шляхам аддзялення Украіны ад Совецкага Саюза імкнуліся адмавіць на Украіне ўладу капіталістаў і памешчыкаў і ператварыць Украіну ў сваю калонію. Ужо тады партыя кваліфікавала шумскізм, які праповедаў разрыў Украіны з цэнтрам міжнародкай пролетарскай рэволюцыі—Масквой, як праяўленне украінскага фашызма.

Паспяховае правядзенне нацыянальнай палітыкі было і астаецца для партыі магутнай зброяй умацавання пролетарскай дыктатуры, умацавання комуністычнага ўплыва на масы, выхавання іх у духу пролетарскага інтэрнацыяналізма, умацавання ўзаемнага давер'я рабочых і працоўных мас розных нацый, умацавання іх адзінага фронта супроць эксплаататараў усіх нацый. «Характэрнай рысай Кастрычніцкай рэволюцыі з'яўляецца той факт, што яна правяла ў СССР нацыянальна-каланіяльную рэволюцыю не пад флагам нацыянальнай варожасці і міжнацыянальных сутычак, а пад флагам узаемнага збліжэння рабочых і сялян нацыянальнасцей СССР, не ў імя нацыяналізма, а ў імя інтэрнацыяналізма». Гэтыя словы т. СТАЛІНА адносяцца не толькі да Кастрычніцкай рэволюцыі, але і да ўсёй нацыянальнай палітыкі нашай партыі.

II.

Пераход нашай партыі да палітыкі суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як класа, выкарчоўвання апошніх карэннаў капіталізма натыкнулася та адчайнае супраціўленне буржуазна-нацыяналістычных элементаў, у асаблівасці украінскага кулацтва і яго агентуры ў партыі.

Выбітыя з сваёй вытворчай базы, буржуазна-кулацкія элементы працягвалі барацьбу супроць совецкай улады і комуністычнай партыі, ужываючы ў змяніўшыхся абставінах новую тактыку «ціхай сапай», пралізаючы ў нашы прадпрыемствы і ўстановы, соўгасы, МТС, калгасы і нават партыйныя арганізацыі, прабуючы разлагаць іх знутры, асабліва шырока ўжываючы метады ашуканства, двурушнічства і маскавання. Гэта новая тактыка натыкнулася старымі правадырамі украінскай контр-рэволюцыі — Вінічэнка, Грушэўскім, Шаповалам і інш.

Канец адноснай стабілізацыі капіталізма, пераход да новага тура рэволюцый і войн, японская акупацыя Манчжурыі і Паўночнага Кітая азначалі ўзмацненне небяспекі ваеннага нападу на СССР. У сувязі з гэтым стаўка на інтэрвенцыю стала асноўнай установай усіх контр-рэволюцыйных арганізацый, выкрытых на Украіне за апошнія гады, цесна звязаных з германскім і польскім фашызмам, пачынаючы з узначаленага быўшымі петлюраўскімі міністрамі Ефрэмавым, Чахаўскім і Нікоўскім «Саюза вызвалення Украіны» (СВУ) і канчаючы «Аб'яднаннем украінскіх нацыяналістаў» (АУН), кіруемым агентам нямецкіх фашыстаў, катам кіеўскіх рабочых Канавальцам.

Устанаўленне фашысцкай дыктатуры ў Германіі, прамое падтрыманне рускіх і украінскіх белагвардзейцаў германскімі фашыстамі і ангельскімі цвёрдалобымі, адкрытая прапаганда адарвання Украіны ад Совецкага Саюза ў германскім фашысцкім друку, публічныя выступленні адказных польскіх фашысцкіх колаў (Салега, Мацкевіч) за антысовецкі блок Польшчы з фашысцкай Германіяй і, нарэшце, барацьба паміж польскімі і германскімі фашысцкімі коламі за гегемонію ў лагеры украінскай контр-рэволюцыі — усё гэта, безумоўна, стымулявала контр-рэволюцыйную актыўнасць рэшткаў разгромленых капіталістычных элементаў на Совецкай Украіне. Тыя-ж самыя прычыны выклікалі шапёны рост антысовецкай актыўнасці з боку Заходня-украінскай буржуазіі, з боку прадаўшыхся польскім і нямецкім памешчыкам і капіталістам рэшткаў ранейшых дробна-буржуазных украінскіх партый социялістаў-рэволюцыянераў, социял-дэмакратаў і інш., якія заўсёды знаходзіліся ў самай цеснай сувязі з кулацка-пятлюраўскімі элементамі на Совецкай Украіне і вялі сваю контр-рэволюцыйную работу на грошы замежных контр-разведак. Адна частка гэтых украінскіх нацыяналістаў імкнецца здаць працоўныя масы Совецкай Украіны ў кабалу польскім памешчыкам і капіталістам (А. Левіцкі, Г. Левіцкі, О. Луцкі, Ганкевіч, Старасольскі), а другая іх частка (Канавалец, Данцоў, Д. Паліеў) хоча зноў надзець на Украіну ярмо германскага імперыялізма, скінутае працоўнымі масамі Украіны ў 1918 годзе.

У раз'юшанай інтэрвенцыянісцкай кампаніі, якая праводзіцца за граніцай, асабліва на Заходняй Украіне, аб'ядналася ахвосце пятлюраўшчыны (на чале з так званым «урадам А. Левіцкага»), агенты польскага фашызма з украінска-нацыянальна-дэмакратычнага аб'яднання (украінскія памешчыкі Д. Левіцкія, Луцкія і К°), гітлераўскія наймёты з украінскай ваеннай арганізацыі — Канавалец і К°, а таксама ўсе адценні украінскага социял-фашызма: радыкалы, галіцкія социял-дэмакраты, рэшткі украінскіх эсэраў і социял-дэмакратаў — Ганкевічы, Грыгор'евы, Мазепы, Федэнкі, Шумскісты, Валынцы і Крайкоўскія — самыя гнусныя і подлыя здрадзеі украінскага народа, якія прадаваліся за любую цану памешчыкам і капіталістам любой краіны. Усе гэтыя часткі апалячаныя, часткі анямечаныя прыспужнікі замежных памешчыкаў і капіталістаў, разам з праваслаўнымі і уніяцкімі папамі, мітрапалітамі Шэптыцкім і Хамішыным, разам з манархістамі-чорнасоценцамі з лагера гетмана Скарападскага, аб'ядналіся супроць рабочых і сялян Украіны, будуючых сваю социялістычную гаспадарку, сваю украінскую совецкую культуру, сваю украінскую совецкую дзяржаўнасць.

Рост актыўнасці антысовецкіх элементаў, якія падтрымліваюцца імперыялістычнымі коламі розных буржуазных краін, патрабаваў і патрабуе ад компартыі Украіны асаблівай пільнасці ў барацьбе на два фронты — супроць вялікадзяржаўнага рускага і украінскага нацыяналізма і супроць нацыяналістычных ухілаў унутры партыі, патрабаваў і патрабуе ўзмацнення партыйнай увагі практычнаму правядзенню нацыянальнай палітыкі.

І, аднак, КП(б)У праглядзела і своечасова не ўскрыла ўзмоцненага пранікнення украінскіх нацыяналістычных элементаў, рэштак разгромленага класавага ворага ў кіруючыя органы калгасаў, МТС, у розныя совецкія, замежныя, культурныя органы і нават партыйныя арганізацыі для шкодніцтва і контр-рэволюцыйнага сабатажа мерапрыемстваў партыі і совецкай улады.

Контр-рэволюцыйныя элементы, з-за аслаблення большэвіцкай пільнасці партыйных арганізацый, пры патуранні, а часам і пры садзейнасці некаторых «комуністаў», расстаўлялі свае сілы для арганізацыі сабатажа і шкодніцтва і, карыстаючыся флагам украінізацыі, ажыццяўлялі буржуазна - нацыяналістычныя метады ўзаемнага адчужэння працоўных розных нацый і распальвання нацыянальнай варожасці. Стварыліся цэлыя гнёзды контр-рэволюцыйных двурушнікаў у радзе наркаматаў (Наркамасветы, Наркамзем, Наркамюст), у навуковых установах (Усеукраінскі інстытут марксізма-ленінізма, Акадэмія навук, Сельска-гаспадарчая акадэмія, інстытут шаўчэнкаказнаўства), і нават у партыйным кіраўніцтве паасобных раёнаў. Буржуазна-нацыяналістычныя элементы, пралезшыя ў совецкія і нават партыйныя органы, сустрэлі прамое падтрыманне з боку украінскіх нацыянал-ухілісцкіх элементаў, якія самкнуліся з імі ў сваёй падрыўной рабоце супроць партыі.

Аслабленне большэвіцкай пільнасці, аблягчаўшае магчымасць контр-рэволюцыйным элементам разгарнуць шырокую работу і прычыніць вялікую шкоду справе социялістычнага будаўніцтва на Украіне, з'явілася сур'ёзнай памылкай компартыі Украіны і ЦК КП(б)У, як не кіруючага органа.

Комуністычная партыя (большэвікоў) Украіны і яе ЦК, якія некалькі год таму назад пераможна разграмілі шумскізм, за апошні час з-за аслаблення большэвіцкай барацьбы з украінскім нацыяналізмам праглядзелі афармленне новага нацыяналістычнага ўхіла ў радах партыі, які ўзначальваўся Н. А. Скрыпнікам.

Яшчэ ў 1923 г., пры абмеркаванні пытання аб аб'яднанні совецкіх рэспублік у саюзную дзяржаву, Скрыпнік пад націскам нацыяналістычных элементаў дапусціў грубейшую памылку, выказаўшыся супроць стварэння адзінай саюзнай дзяржавы з адзінай знешняй палітыкай і т. п. Тады-ж Скрыпнік прабаваў падмяніць барацьбу на два фронты — супроць вялікадзяржаўнага (рускага) і мясцовага шавінізма барацьбой толькі супроць вялікадзяржаўнага шавінізма, што азначала прамое падтрыманне украінскага нацыяналістычнага ўхіла. Ужо тады украінскія нацыяналісты пачалі абвапакаць Скрыпніка і прабаваць процістаўляць яго лінію лініі партыі.

За апошнія гады ў абставінах шалёнага супраціўлення рэштак капіталістычных элементаў нашаму пераможнаму социялістычнаму наступленню пад прамым уплывам гэтых элементаў памылкі Скрыпніка выраслі ў цэлую сістэму нацыянал-апартуністычных поглядаў, з якіх выцякала прымірэнцтва да украінскага нацыяналізма, якое ператварылася ў простае змыканне з ім. Пазіцыя Скрыпніка з'явілася адлюстраваннем нездаволення аджываючых класаў Украіны рэжымам дыктатуры пролетарыята. Гэта пазіцыя аб'ектыўна азначала заклік адзіліцца, адыйсці ад СССР, дзе будуецца социялізм, і павярнуцца тварам да Галіцыі, дзе украінскі народ прыгнятаецца і эксплуатуецца памешчыкамі і капіталістамі.

Да Скрыпніка і групы нацыянал-ухілістаў, якая ім узначальвалася, цапкам і поўнасцю адносіцца тое, што сказаў на 16-м партыйным з'ездзе т. Сталін аб сутнасці ўхіла да мясцовага, у даным выпадку украінскага нацыяналізма.

«Сутнасць ухіла да мясцовага нацыяналізма заключаецца ў імкненні абасобіцца і замкнуцца ў рамках сваёй нацыянальнай шкарлупіны, у імкненні затушаваць класавыя супярэчнасці ўнутры сваёй нацыі, у імкненні абараніцца ад вялікага-рускага шавінізма шляхам адхода ад агульнага патока социялістычнага будаўніцтва, у імкненні не бачыць таго, што збліжае і злучае працоўныя масы нацыянальнасцей СССР, і бачыць толькі тое, што можа іх аддзяліць адно ад другога».

«Ухіл да мясцовага нацыяналізма адлюстроўвае нездаволенне аджываючых класаў раней прыгнечаных нацый рэжымам дыктатуры пролетарыята, іх імкненне адасобіцца ў сваю нацыянальную дзяржаву і ўстанавіць там сваё класавае панаванне. Небяспека гэтага ўхіла заключаецца ў тым, што ён культывуе буржуазны нацыяналізм, аслабляе адзінства працоўных народаў СССР і грае на руку інтэрвенцыяністам».

Калі для партыі, нацыянальная палітыка была і астаецца зброяй інтэрнацыяналізма, канчатковай мэтай якой з'яўляецца ўстанаўленне комунізма і зліццё ўсіх нацыянальнасцей, дык Скрыпнік, проста адыходзячы ў нацыянальным пытанні ад ленінізма, за апошнія гады стаў скочвацца на пазіцыю украінскіх нацыяналістаў, якія прабавалі скарыстаць ленінскую нацыянальную палітыку ў інтарэсах украінскага нацыяналізма для падначалення Украіны замежным капіталістам і памешчыкам. Адсюль сістэматычная лінія Скрыпніка і ўзначальваемага ім нацыяналістычнага ўхіла на аслабленне гаспадарчых, дзяржаўных і культурных сувязей Украіны з іншымі совецкімі рэспублікамі, на аслабленне Совецкага Саюза, на максімальны адрыў украінскай мовы ад рускай, на замену падобных да рускіх слоў ва украінскай мове польскімі, чэшскімі, нямецкімі, тэндэнцыі да правядзення гвалтоўнай украінізацыі ў школе. Нацыяналістычны ўхіл Скрыпніка і плыні, якая ім узначальвалася, аблягчаў работу украінскіх нацыяналістаў, накіраваную на адрыў Украіны ад Совецкага Саюза і ператварэнне яе ў калонію польскага фашызма ці германскага імперыялізма, аблягчаў работу рускіх белагвардзейцаў і замежных інтэрвентаў, якія, таксама імкнучыся да адрыва Украіны ад Совецкага Саюза, хочуць нанесці ўдар эканамічнай і палітычнай магутнасці Саюза, інтэрнацыянальнага цэнтра пролетарскай рэволюцыі.

III.

Рашэнні ЦК УсеКП(б) ад 14 снежня 1932 г. і ад 24 студзеня г. г. паклалі пачаткам сур'ёзнай самакрытыкі ў радах КП(б)У і выпраўленню дапушчаных памылак як у галіне кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, так і ў галіне практычнага правядзення нацыянальнай палітыкі. Своячасовае і правільнае выступленне тав. Постышава на чэрвеньскім пленуме ЦК КП(б)У з'явілася штурмам да разгорнутага абмеркавання нацыяналістычнага ўхіла Скрыпніка і яго аднамысліных. Без усёбадамлення ўсёй КП(б)У сутнасці нацыяналістычнага ўхіла, які ўзначальваўся Скрыпнікам, без самай рашучай барацьбы з гэтым ухілам немагчыма правядзенне сапраўднай большэвіцкай украінізацыі, сапраўднага інтэрнацыянальнага выхавання мас, немагчыма далейшы рост украінскай совецкай культуры.

Пленум ЦК і ЦКК КП(б)У высоўвае перад компартыяй Украіны ў галіне правядзення нацыянальнай палітыкі наступныя асноўныя задачы:

1. Інтэрнацыянальнае выхаванне мас, барацьба на два фронты і галоўная небяспека

Далейшае правядзенне большэвіцкай украінізацыі, непарыўна звязанае з інтэрнацыянальным выхаваннем мас, павінна адбывацца на аснове непаслабнай барацьбы на два фронты — супроць вялікадзяржаўнага рускага шавінізма, і украінскага нацыяналізма, на аснове са праўднага забеспячэння большэвіцкага партыйнага кіраўніцтва будаўніцтвам украінскай социялістычнай культуры.

Вялікадзяржаўны рускі шавінізм з'яўляецца па-ранейшаму галоўнай небяспекай у маштабе ўсяго Совецкага Саюза і ўсёй УсеКП(б). Але гэта ні ў якой меры не супяраэшць таму, што ў некаторых рэспубліках СССР, у асаблівасці на Украіне, у даны момант галоўную небяспеку прадстаўляе мясцовы украінскі нацыяналізм, які змыкаецца з імперыялістычнымі інтэрвентамі. Неабходна асабліва мець на ўвазе новую тактыку рускіх вялікадзяржаўных шавіністаў і украінскіх нацыяналістаў, падтрымліваемых усёй контр-рэволюцыяй, у тым ліку і трацкістамі, якія на сучасным этапе блакіруюцца паміж сабой на агульнай платформе адрыва Украіны ад СССР і грае на руку інтэрвенцыяністам».

Далейшае правядзенне большэвіцкай украінізацыі, непарыўна звязанае з інтэрнацыянальным выхаваннем мас, павінна адбывацца на аснове непаслабнай барацьбы на два фронты — супроць вялікадзяржаўнага рускага шавінізма, і украінскага нацыяналізма, на аснове са праўднага забеспячэння большэвіцкага партыйнага кіраўніцтва будаўніцтвам украінскай социялістычнай культуры.

Вялікадзяржаўны рускі шавінізм з'яўляецца па-ранейшаму галоўнай небяспекай у маштабе ўсяго Совецкага Саюза і ўсёй УсеКП(б). Але гэта ні ў якой меры не супяраэшць таму, што ў некаторых рэспубліках СССР, у асаблівасці на Украіне, у даны момант галоўную небяспеку прадстаўляе мясцовы украінскі нацыяналізм, які змыкаецца з імперыялістычнымі інтэрвентамі. Неабходна асабліва мець на ўвазе новую тактыку рускіх вялікадзяржаўных шавіністаў і украінскіх нацыяналістаў, падтрымліваемых усёй контр-рэволюцыяй, у тым ліку і трацкістамі, якія на сучасным этапе блакіруюцца паміж сабой на агульнай платформе адрыва Украіны ад СССР і грае на руку інтэрвенцыяністам».

2. Падрыхтоўка большэвіцкіх украінскіх кадраў

Рашаючае значэнне для сучаснага момента мае падрыхтоўка і выхаванне большэвіцкіх украінскіх кадраў у калгасах, соўгасах, МТС, заводах ВНУ і ВТНУ, асабліва з моладзі і адданай справе социялістычнага будаўніцтва совецкай інтэлігенцыі, прасоўванне іх на ўсе ўчасткі социялістычнага будаўніцтва. Умацаванне большэвіцкага кіраўніцтва совецкімі, навуковымі і гаспадарчымі ўстановамі з усёй вастраткой ставіць пытанне аб вылучэнні і вырошчванні сапраўдных совецкіх украінскіх кадраў як партыйных, так і беспартыйных. Пленум лічыць неабходным правесці падбор і вылучэнне лепшых калгасных работнікаў украінцаў як партыйных, так і беспартыйных, на совецкую работу ў распубліканскім, абласным і раённым маштабе. Пленум лічыць неабходным вылучыць пэўную колькасць павышаных стыпендый для найбольш здольных рабочых і калгаснікаў украінцаў, якія вучацца ў ВНУ і ВТНУ, а таксама для маладых вучоных работнікаў навуковага і культурнага фронта. ЦК і ЦКК КП(б)У зварачаюць асаблівую ўвагу на падбор кадраў для раёна, які з'яўляецца важнейшым звяном социялістычнага будаўніцтва, а значыць і нацыянальнай палітыкі, як яго непарыўнай сустрэчнай часткі.

ЦК і ЦКК КП(б)У лічаць неабходным узмацніць падрыхтоўку большэвіцкіх украінскіх кадраў партыйных работнікаў. Для падрыхтоўкі кіруючых работнікаў абласных партыйных арганізацый Украіны, гарпарткомаў і рашаючых сельска-гаспадарчых раёнаў ЦК і ЦКК КП(б)У пастанаўляюць стварыць у Харкаве курсы марксізма-ленінізма пры ЦК КП(б)У на 150 чал. з паўтарагадовым тэрмінам навучання.

Падрыхтоўку высокакваліфікаваных навуковых работнікаў, выкладчыцкіх кадраў скансцэнтраваць у аб'яднаным інстытуце чырвонай прафесуры. Рэарганізаваць усеукраінскую вышэйшую с.-г. комуністычную школу імя Арцёма ва ўсеукраінскі комуністычны сельска-гаспадарчы універсітэт.

3. Аб масавай рабоце і кіраўніцтве друкам

ЦК і ЦКК КП(б)У прапануюць усім партыйным арганізацыям забяспечыць належнае большэвіцкае кіраўніцтва партыйна-выхаваўчай і партыйна-масавай работай, даючы рашучы адпор недаацэнцы гэтай работы, дабіваючыся паляпшэння якасці друку, партыйнай асветы і ўсёй масава-растлумачальнай работы, якая павінна весціся ў духу сапраўднага пролетарскага інтэрнацыяналізма.

Стварэнне каля 400 палітаддзельскіх газет, вялізарная большасць якіх выходзіць на украінскай мове, з'яўляецца буйнейшым дасягненнем большэвіцкай украінізацыі.

Пленум даручае палітбюро ЦК КП(б)У намеціць практычныя мерапрыемствы па далейшаму павышэнню якасці ідэалагічнага ўзроўня ўсяго друку, асабліва раённага і палітаддзельскага, па падрыхтоўцы кадраў работнікаў друку.

4. Умацаванне органаў Наркамасветы і навуковых устаноў

Адной з важнейшых задач у галіне правядзення нацыянальнай палітыкі з'яўляецца ўмацаванне органаў Наркамасветы, асабліва абласных і раённых органаў, вытрыманымі партыйнымі сіламі, паляпшэнне партыйнай і комсамольскай работы сярод настаўніцтва ў педагагічных ВНУ, выхаванне настаўніцкіх мас у духу пролетарскага інтэрнацыяналізма. Умацаваўшыся ў вёсцы калгасы пад патрабуе вялізарнага павышэння якасці работы школы і настаўніцтва.

Пленум ухваляе прынятыя палітбюро ЦК КП(б)У меры па выпраўленню перагібаў і скажэнняў нацыянальнай палітыкі ў школе, дапушчаных ранейшым кіраўніцтвам Наркамасветы.

Пленум ухваляе рашэнне палітбюро і аргбюро ЦК КП(б)У аб правапісе, аб умацаванні Акадэміі навук, с.-г. акадэміі, інстытута шэўчэнкаказнаўства і ачышчэнні іх ад чужых варожых элементаў.

5. Кіраўніцтва тэарытычным фронтам

Самай сур'ёзнай увагі ўсіх партыйных арганізацый патрабуе работа на тэарытычным фронце (гісторыя, філасофія, палітычная эканомія, аграрная пытанне). Мы мелі на гэтым фронце зухтанне. Мы мелі на гэтым фронце зухтанне недастатковую барацьбу з буржуазна-нацыяналістычнай кантрабандай (тэорыя безбуржуазнасці украінскай нацыі, прыкрашванне дзейнасці буржуазіі, пашырэнне ідэйнасці буржуазіі, пашырэнне ідэйнасці буржуазіі, пашырэнне ідэй

ЦВЕРДЫ ГРАФІК РАМОНТА, КАНТРОЛЬ ЗА ЯКАСЦЮ—У КОЖНУЮ МТМ

„Пытанні завяршэння падрыхтоўкі да асення-зімовага рамонта трэба хутчэй рашаць і ў поўным аб'ёме" (ПОСТЫШАУ)

Адрамантуем трактар за 140 гадзін

Рабочыя клімавіцкай МТМ адказваюць на выклік аршанцаў

За кіламетр ад ст. **Клімавічы** на Магілеўку вырас вялізарны цагляны будынак клімавіцкай МТМ. Вакол яго вырастаюць і іншыя будынкі: кантора пабудовай, гараж, кватэры для ІТР, сталоўка для рабочых.

Майстэрня электрыфікавана, устаноўлены варштаты. Цэхі пераведзены ў рэшоткі, светлыя памяшканні.

У мінулым годзе майстэрня працуе пра капітальны рамонт: 120 трактараў, столькі-ж матораў і каленчатых валаў. Якасць работы была не высокая. Часта адрамантаваны трактар пра пакінуты здаў работы прыходзіўся ставіць на паўторны рамонт. За якасць рамонта ў МТМ змагаліся слаба.

У гэтым годзе, дзякуючы штодзённай дапамозе палітаддзела МТС, МТМ добіўся значных поспехаў: узнялася прадукцыйнасць працы, палепшылася якасць рамонта. Калі летам рабочы абточваў у змену толькі адзін каленчаты вал, дык зараз ён ударнік **Лічанкоў** у змену абточвае тры каленчатых валы на тым самым варштаце і дае высокую якасць абточкі.

МТМ дабіўся значных тэхнічных дасягненняў, яна на сваіх варштатах вырабляе такія часткі да трактараў, як паршневыя кольцы, шатунныя балты, жыклеры, рогулёзачныя галкі; картэрныя і радыятарныя балты, шпількі блока, шпільки і гайкі карбюратараў.

На плану ў гэтым годзе клімавіцкая МТМ павінна прапусціць праз капітальны рамонт 117 трактараў, столькі-ж матораў і каленчатых валаў.

Па календарнаму плану трэба адремантаваць: у кастрычніку і лістападзе 29 трактараў, 2 маторы і 5 прычэпных плугоў; у снежні—30 трактараў, 30 матораў, 30 каленчатых валаў, у студзені—30 трактараў, 30 матораў, 30 каленчатых валаў; у лютым — 21 трактар, 21 матор, 30 каленчатых валаў; у сакавіку—5 трактараў, 5 матораў. Да 15 сакавіка рамонт павінен быць скончан поўнае цю.

Лёт рабочых аршанскай МТМ выклікаў сярод рабочых і ІТР клімавіцкай МТМ уздым працоўнага энтузіязму.

22 лістапада на агульным сходзе рабочыя падрабязна абгаварылі гэты выклік аршанскіх таварышоў і пастанавілі поўнасцю прыняць яго. Рабочыя абавязаліся ў тэрмін выканаць план капітальнага рамонта трактараў, даць самую высокую якасць. Колькасць затрачанага рабочага часу на выпуск трактара з капітальнага рамонта скараціць не менш як на 30 проц.

«Мы будзем працаваць баявымі тэмпамі,—апавядаюць у сваім лісце рабочыя і ІТР клімавіцкай МТМ рабочым аршанскай МТМ. У мінулым годзе на выпуск трактара з капітальнага рамонта мы трацілі 180 гадзін рабочага часу, а ў гэтым годзе толькі —150. У далейшым будзем выпускаць трактар за 140 гадзін.

Брыгады нашых лепшых ударнікаў-энтузіястаў **Цімашэнкі Ціта, Каца Г.** і **Судзілоўскага** абавязуюцца выпускаць з капітальнага рамонта трактар за 135 рабочых гадзін—17 дзён.

— Рамонт усяго машына-трактарнага парка мы скончым да 15 лютага, на месяц раней устаноўленага тэрміна, і якасць рамонта дамо самую высокую».

Палітаддзел клімавіцкай МТС аказвае вялікую дапамогу МТМ у яе штодзённай рабоце. Каб узняць тэхнічны ўзровень рабочых, пры МТМ арганізаваны шасцімесячныя курсы па аўладанню тэхнікай. Усе рабочыя майстэрні вучацца на гэтых курсах. Арганізован палітгурток.

Рабочая сталоўка МТМ забяспечвае рабочых добраякасным і смачным абедамі, сняданнем і вячэрай. Ёсць стол ударніка. Пры майстэрні пабудован душ.

У бліжэйшы час пры майстэрні арганізуецца чырвоны куток і чытальня з бібліятэкай.

Спынілася цякучасць рабочай сілы, якая была раней. Наладжана працоўная дысцыпліна. На рабоце ўкхываюцца сацыялістычныя метады работы—соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Клімавіцкая МТМ упарта змагаецца за пярэнства ў БССР.

Корсік.

ЗАКАЗЧЫКІ ЗРЫВАЮЦЬ РАБОТУ

РАГАЧОЎ. (Наш кар.).

Да рамонтнай кампаніі **РАГАЧОЎСКАЯ МТМ** у гэтым годзе падрыхтавалася лепш чым летась. Своечасова быў падобран кастанны кадр кваліфікаваных рабочых. Правільна расставілі сілы на брыгадах па строга вызначаных вытворчых працэсах.

Часткі трактара на канвеєру паступаюць ад адной брыгады да другой. Дрэнна адрамантаваныя часткі брыгада ад брыгады не прымае. Гэта дало магчымасць павысіць якасць рамонта трактараў. **У выніку такой арганізацыі працы, МТМ перавыканала настрычніцкі план рамонта. Замест 16 трактараў, адрамантавана 18.**

Але МТМ зараз вымушана будзе рабіць прастой з-за адсутнасці такіх запасных частак для трактараў «Фардзон-Пуцілавец», як поршні, паршневыя кольцы, шатунныя балты.

Гэтага прастоя МТМ магла-б пазбавіцца, калі-б былі для рамонта трактары «Інтэрнацыянал», да якіх у МТМ ёсць запасныя часткі. Але трактараў маркі «Інтэрнацыянал» у МТМ няма. МТС, соўгасы, з якімі заключаны дагавары на рамонт, іх яшчэ не прыслалі, хоць тэрміны даўно прайшлі. З 20 трактараў «Інтэрнацыянал» паступіла для рамонта толькі 5, якія ўжо зараз знаходзяцца ў зборцы. Астатнія кавінны паставіць **Цялушская МТС**, соўгасы лугтроста, соўгас **Мормаль**, Жлобінскага раёна, соўгас **Дзёзенка**, Магілёўскага раёна.

МТМ павінна была заключыць дагавары на рамонт 174 трактараў. Гэта яе вытворчая праграма, але покуль заключаны дагавары толькі па 135. Не заключаюць дагавары такія МТС як **Жлобінская** і прымацаваныя да МТМ калгасы. Адрамантаваныя трактары і маторы ўжо два тыдні стаяць і не прымаюцца заказчыкамі, хоць ім МТМ не раз паведамляла.

Р. В.

ТРАКТАРЫ ЧАКАЮЦЬ РАМОНТА

ЛЕПЕЛЬ. (Наш кар.). Два тыдні таму назад дырэктар Лепельскай МТМ тав. **Ламачынскі** цвёрда запэўніў, што праз два дні майстэрня скончыць буксіраванне і будзе гатова распачаць рамонт. Прайшло не два дні, а два тыдні, а МТМ усё яшчэ не гатова. Выявілася, што пры ўстаноўцы рухавіка забыліся зрабіць адну «дробязь» — выкапаць ступню. Рухавік зараз бяздзейнічае. У МТМ яшчэ няма патрэбнай колькасці кваліфікаваных рабочых, адсутнічаюць запасныя часткі, а трактары прыбываюць і чакаюць рамонта.

Вінаваты ў зрыве будаўніцтва МТМ і кіраўнікі Белсельэлектра. Да апошняга часу не скончана яшчэ электрыфікацыя МТМ. Сельгасснаб не заслаў яшчэ ні адной запаснай часткі.

Дырэктар Ламачынскі не скарыстоўвае мясцовых рэсурсы, а бездапаможна разводзіць рукамі і крычыць: — Як-жа пачынаць рамонт, калі няма гільзаў, няма поршняў.

Між тым у Чашніцкай МТС, трактары якой рамонтуюцца ў МТМ, ляжыць 60 шт. гільз і 16 поршняў. Гэтыя часткі безумоўна могуць і павінны быць скарыстаны для рамонта трактараў. Можна знайсці і ў іншых МТС некаторыя запчасткі і матэрыялы. Трэба толькі гэтым пытаннем як след заняцца.

МТМ павінна адрамантаваць трактарны парк 5-ці МТС: Лепельскай, Чашніцкай, Ушацкай, Сенненскай і Бягомльскай. Па дагавору гэтыя МТС да пачатку рамонта павінны прыслаць рабочых адпаведных кваліфікацый. Да гэтага-ж часу з пяці МТС толькі адна Лепельская прыслала рабочых.

Нельга прайсці і міма такіх фактаў, калі Сенненская МТС прысылае тры трактары без дэфектных ведамасцяй, Чашніцкая МТС прысылае два маторы без частак.

Дырэкцыя МТМ павінна арганізаваць работу ў майстэрні, прымусіць абслугоўваемыя ёю МТС здаваць трактары згодна заключаных дагавораў, дасылаць разам з трактарамі і запасныя часткі і добра складзеныя дэфектныя ведамасці.

Добрае абсталяванне ў МТМ і не дрэннае матэрыяльна - бытавое абслугоўванне рабочых дае магчымасць разгарнуць па-баявому рамонт трактараў і нагнаць прапушчанае.

Л. НІХАМКІН.

Тав. СІНЧУК—лепшы ўдарнік мантажа ЦЭС Крычаўскага цэментнага завода.

Дагавары соцыялістычнай дапамогі транспарту падмацаваць энергічнай работай па выкананню ўзаемных абавязацельстваў

УЗМАЦНІЦЬ ПАВАРОТ ДА ПАТРЭБ ТРАНСПАРТА

Друкуемыя сёння карэспандэнцыі з Гомеля, Віцебска і Жлобіна разам з рэзкай змешчанымі матарыяламі з Дрысы, Оршы, Сіроціна і Ветрына і інш. раёнаў, як і дагавор менскіх арганізацый з чыгункай, сведчаць аб пачатку паварота тэрытарыяльных арганізацый і шырокай пролетарскай і калгаснай грамадскасці тварам да патрэб транспарта. Мы падкрэсліваем, што гэта толькі ПАЧАТАК паварота, бо як паказвае нават матэрыял нарады сакратароў райкомаў партыі, пры гомельскім палітаддзеле Заходніх чыгунак да гэтага часу сістэматычнай дзелавой дапамогі з боку тэрытарыяльных арганізацый транспарту не было.

Партыя патрабуе дзелавой, канкрэтнай дапамогі транспарту. «Гнілая пазіцыя нейтралітэта ў адносінах да транспарта, з якою яшчэ да гэтага часу не парвалі многія мясцовыя арганізацыі, павінна быць зломлена». («Правда»).

Зімовыя ўмовы работы транспарта—найбольш цяжкія. Дрэнна будзе працаваць транспарт — цяжка гэта адабёцца на нашых заводах, фабрыках, калгасах і соўгасах. Добра будзе працаваць — аблегчыць гэта работу ўсёй народнай гаспадаркі. Вось чаму ўздым транспарта, дапамога ў падрыхтоўцы да зімы ёсць справа ўсёй краіны.

Прыкладу ДРЫСЫ, якая першай у БССР падхапіла большэвіцкі пачын палітаддзела Лазоўскай МТС і палітаддзела Харкаўскага чыгуначнага раёна, шырока асветленага ў «Правде», ужо паследавалі дзесяткі раённых арганізацый і палітаддзелаў МТС. Гэта дапамога павінна стаць яшчэ больш масавай. Не можа быць ні адной раённай арганізацыі, ні адной МТС і калгаса, нават-б не ўключыліся ў актыўную дапамогу транспарту.

Заслугоўвае ўвагі змяшчаемы сёння ЖЛОБІНСКІ дагавор. Ён больш шырока ставіць пытанні ўзаемнай дапамогі. Ён адбівае шчырыя клопаты калгаснікаў аб транспарце і рабочых-ударніках і ўмацоўвае ролю пролетарскага шэфства.

Самае галоўнае заключаецца зараз у тым, каб ператварыць дагавары ў сапраўдныя канкрэтныя справы. Закон дагавораў, як закон сур'ёзных палітычных дакументаў, трэба мабілізаваць шырокія масы рабочых, калгаснікаў і працоўных адноасобнікаў. Трэба прадугледзець кожную дробязь падрыхтоўкі да снегабарацьбы і правесці яе ўзорна.

ЗАБЯСПЕЧЫМ АРГАНІЗАВАНУЮ ДАПАМОГУ

ЖЛОБІН. (Ад наш. спецкора).

Пры палітаддзеле **Жлобінскай** МТС адбылася нарада старшынь калгасаў раёна абслугоўвання МТС, на якой падводзіліся вынікі сельска-гаспадарчых работ. На гэтай нарадзе выступіў начальнік палітаддзела **Жлобінскага** чыгуначнага раёна т. **Валкін.**

— Вы падводзіце вынікі пасяхова закончаных сельска-гаспадарчых работ,—гаворыць т. **Валкін.**—Вы атрымалі буйныя перамогі па ўмацаванню калгаснага лада ў вёсцы, па рэалізацыі лозунга т. **Сталіна** аб заможным жыцці калгаснікаў. Гэтых поспехаў яшчэ няма на транспарце. Партыя зараз сур'ёзна паставіла задачу, каб транспарт, нарэшце, вывесці з паласы адставання. Без вашай дапамогі ў гэтай рабоце мы не абыйдземся. Набліжаецца снежныя заносы. Яны могуць дэзарганізаваць работу транспарта, калі не забяспечым арганізаваную барацьбу з імі. За дапамогай у снегабарацьбе мы і звяртаемся да вас.

Старшыні калгасаў з вялікім ухваленнем сустрэлі прапанову начальніка палітаддзела МТС т. **Брыгневіча** аб заключэнні сацыялістычнага дагавора дапамогі транспарту. Тут-жа быў абмяркован і адагалосна прыняты тэкст дагавора паміж палітаддзелам чыгуначнага раёна і палітаддзелам МТС і 14 старшынямі калгасаў.

— Прымаючы пад увагу,—гаворыцца ў дагаворы,—неабходнасць дапамогі транспарту ў добрай падрыхтоўцы да зімы, палітаддзел **Жлобінскай** МТС разам з калгасамі раёна дзейнасці МТС абавязуюцца: забяспечыць сваімі сіламі работы па снегабарацьбе, ачыстку ад снега шляхоў 29 дыстанцый, у прыватнасці на 1, 2 і 4 акалодках.

Прымацаваць калгасы да паступных акалодкаў:

Калгас імя **11-годдзя Беларусі** дае 10 чалавек і 3 фурманкі па ст. **Жлобін**, пушавой буцы 288 кіламетра; брыгадзірам вылучаецца **Валькоў.** Да другога акалодка прымацоўваюцца калгас **«Чырвоны партызан»**—дае 15 чалавек на ст. **Жлобін**, калгас **«Маяк»**—дае 5 чал.; калгас **«Чырвоны гарадок»** дае 15 чалавек на ст. **Жлобін-Паўднёвая**; калгас **«Колас»** дае 5 чал., **«Чырвоны Жлобін»** —10, **«Чырвоны касавік»**—25; **«На варце»** —25, і г. д.

У кожным калгасе арганізуюцца брыгады з вылучаных калгаснікаў для снегабарацьбы, на чале якіх вылучаецца брыгадзір, які адказвае за свячасовы выхад калгаснікаў на снегабарацьбу. З ім-жа дагаварваецца майстар або пушавы брыгадзір пакоп часу выхада брыгады на работу. Да кожнай брыгады прымацоўваюцца комуністы і комсамольцы ў якасці партыйных і комсамольскіх арганізатараў.

У якасці кіраўнікоў брыгад вылучаюцца лепшыя ўдарнікі-калгаснікі, якія сябе праявілі ў барацьбе за ўраджай.

Спецыяльным пунктам у дагаворы прадугледжана дапамога МТС і калгасаў прыгараднай гаспадарцы чыгуначнага вузла. Яны абавязаліся вясной узараць 30 гектараў палявой зямлі для прыгараднай гаспадаркі, аказаць дапамогу насеннем і агрэгатамі, а таксама ўзяць 50 гектараў гарода.

Палітаддзел чыгуначнага раёна і 29 дыстанцыяў шляха ў сваю чаргу ўзялі на сябе абавязацельства: **да 25 ліста пада заключыць дагаворы з кожным калгасам,** з устанаўленнем дакладнага месца яўкі калгаснікаў на снегаўборку. Забяспечыць свячасовую выплату калгаснікам за праведзеную работу; забяспечыць іх цёплым памяшканнем і праводзіць культурна-масавую работу ў часы адпачынку.

Палітаддзел і прафарганізацыі Жлобінскага вузла абавязаліся аказаць дапамогу палітаддзелу МТС па гаспадарча-палітычнаму ўмацаванню калгасаў, рамонту трактарнага парка МТС і сельска-гаспадарчых прылад у калгасах. Для гэтага МК цягі прымае шэфства над калгасам «Чырвоны партызан», МК руку—над калгасам «Чырвоная зорка», МК шляху—над калгасам «На варце», МК сувязі—над калгасам імя 11-годдзя Беларусі і г. д.

Для ўмацавання сувязі паміж чыгуначнымі арганізацыямі і калгасамі ў дагаворы прадугледжан выпуск не радзей аднаго разу ў месяц аб'яднанага нумара газеты **«Чырвоны трактарыст»** і **«Ударнік»**, а таксама праводзіць сумесныя злёты ўдарнікаў-чыгуначнікаў і калгаснікаў і абменьвацца вопытам работы палітаддзелаў.

Р. Пролетарскі.

САМАЕ ГАЛОЎНАЕ—ПРАКТЫЧНА РЭАЛІЗАВАЦЬ ДАГАВАРЫ

ГОМЕЛЬ. (Спецыяльна поштай ад нашага спецкора).

У **Гомелі** адбылася скліканая **ЦК КП(б)Б** нарада палітаддзела 5-га эксплаатацыйнага раёна і начальнікаў дыстанцый шляха сумесна з сакратарамі тэрытарыяльных райкомаў КП(б)Б і начальнікамі палітаддзелаў МТС радыуса абслугоўвання чыгуначнага раёна.

На нарадзе прысутнічалі прадстаўнікі **гомельскага, рэчыцкага, Хойніцкага, Петрыкаўскага і Буда-кашалёўскага РК КП(б)Б,** начальнікі палітаддзелаў Хойніцкай, Рэчыцкай і Гомельскай МТС, прадстаўнікі чатырох райкомаў партыі і палітаддзелаў Украіны, тэрытарыяльна размешчаных у раёне дзеяння чыгункі, прадстаўнік ЦК КП(б)Б і палітсектара НКЗ БССР.

У парадку дня нарады стаяла ўсяго адно пытанне: аб арганізаванай дапамозе тэрытарыяльных арганізацый транспарту ў снегабарацьбе.

Начальнік палітаддзела чыгуначнага раёна т. **Снедзе**, адкрываючы нараду, падкрэсліў выключную важнасць штодзённай дапамогі тэрытарыяльных арганізацый транспарту ў барацьбе за выразную, бесперабойную работу транспарта, у першую чаргу ў падрыхтоўцы да зімы.

— Трэба рашуча пакончыць з настроямі, — гаворыць т. **Снедзе**, — якія асабліва праявіліся ў сувязі з перадачай транспартных партыйных арганізацый чыгуначным палітаддзелам і заключаюцца ў тым, што некаторыя райкомы партыі (Церахаўскі) лічаць, фаз перадача зроблена, то нас цяпер не датычаць пытанні транспарта, мы за іх не адказваем».

— Нашы патрабаванні да вас сёння — працягвае т. **Снедзе**, — вельмі скромныя. Мы прад'явілем вам два рахункі. Першы — прымусіць кліентуру працаваць больш выразна. Нельга больш цярпець такога становішча, калі, напрыклад, у Гомелі па вінё кліентуры вагоны прастойваюць па 16 гадзін, чакаючы пагрузкі і выгрузкі.

Другі — актыўна ўключыцеся ў баявую арганізацыю снегабарацьбы. Гэта работа патрабуе асаблівай падрыхтоўкі. Снегабарацьба будзе выражаць поспех нашых зімовых перавозак і ваша дапамога ў гэтай барацьбе патрэбна найбольш моцная. Тав. **Снедзе** звярнуў увагу нарады на вопыт **Лазоўскага** палітаддзела МТС і палітаддзела Харкаўскага чыгуначнага раёна.

Начальнікі дыстанцый шляха ў сваіх выступленнях, як правільна указаў тав. **Снедзе**, занадта прыфарбавалі стан падрыхтоўкі да снегабарацьбы. Па іх дакладах фактычна ўсё ўжо гатова. Адна, гэта толькі фармальна. Па сутнасці справа стаіць зусім інакш. Дыстанцыі шляха, напрыклад, абмяркоўваліся фармальна. Заключэнне пад дагавораў в калгасамі, не праводзячы ніякай масавай работы, не ўзняўшы гэта мерапрыемства на калітычную вышыню. Яшчэ непадрыхтаваны баракі, не ацеплены памяшканні для рабочых, занятых на снегабарацьбе. Няма плана культурнага абслугоўвання іх. Начальнік райорса **Пашкевіч** не мог нарадзе далажыць канкрэтны план арганізацыі грамадскага харчавання ў часе снегабарацьбы.

З выступленняў прадстаўнікоў райкомаў партыі і начальнікаў палітаддзелаў МТС высветлілася, што большасць раённых арганізацый практычна яшчэ вельмі мала дапамагае транспарту. Нават гомельскія райарганізацыі, дапамога якіх, як правільна падкрэслівалі на нарадзе, павінна была быць асабліва значнай, да апошніх дзён не аказвалі яе. Прадстаўнік гомельскага гаркома т. **Яцкевіч** вымушан быў у сваім выступленні гаварыць толькі аб тым, што трэба будзе зрабіць, а не аб тым, што ўжо зроблена.

Тав. **Зыкоў** — культпроп хойніцкага райкома партыі, каб апраўдаць самаадхіленне райкома ад пытанняў транспарта, стараўся ўзваліць віну па чыгуначныя арганізацыі, якія, моў, мала звяртаюцца да іх за дапамогай.

Усе выступаўшыя прадстаўнікі тэрытарыяльных арганізацый абавязаліся рашуча ўзмацніць штодзённую дапамогу транспарту.

Пры агульным ухвалённі на нарадзе быў прыняты **соцыялістычны дагавор аб ўзаемнай дапамозе** паміж прадстаўнікамі палітаддзела чыгуначнага раёна і кіруючым складам дыстанцый шляху — з аднаго боку, і сакратарамі райкомаў партыі і начальнікамі палітаддзелаў МТС — з другога.

— Палітаддзелы на транспарце, райкомы партыі, палітаддзелы МТС, чыгуначныя і калгасныя партыйныя арганізацыі, — гаворыцца у дагаворы, — павінны дабіцца такога становішча, каб кожны калгаснік зразумеў, што яго дапамога транспарту ў снегабарацьбе з'яўляецца неабходным доўгам перад дзяржавай.

Сакратары райкомаў партыі, начальнікі палітаддзелаў МТС у справе канкрэтнай дапамогі ў снегабарацьбе Гомельскаму чыгуначнаму раёну пры маюць на сябе наступныя абавязацельствы: забяспечыць па зімовы перыяд, **пачынаючы з 22 лістапада 1933 г. па 1 мая 1934 г., для снегабарацьбы 25, 26, 27 і 28 дыстанцый шляха рабочай сілай у колькасці 7.712 чал. і 1.849 фурманак.**

Далей ідзе пералічэнне, колькі, якіх раён і палітаддзел даюць рабочай сілы і фурманак адпаведнай дыстанцыі: 26-й дыстанцыі даюць гомельскі гарком і палітаддзел МТС 910 чал. і 225 фурманак, **Б.-Кашалёўскі** РК і палітаддзел МТС — 160 чал. і 33 фурманкі; 27-й дыстанцыі **гомельскі** гарком і палітаддзел МТС даюць 1.007 чал. і 341 фурманку, **рэчыцкі** райком і палітаддзел МТС — 375 чалавек, 103 фурманкі; для 28-й дыстанцыі **рэчыцкі** райком і палітаддзел МТС даюць 252 чал. і 58 фурманак; **петрыкаўскі** РК і палітаддзел МТС — 341 чал. і 80 фурманак і **хойніцкі** РК і палітаддзел МТС — 215 чал. і 58 фурманак.

Уся рабочая сіла, выдзеленая на снегабарацьбу, арганізуецца ў брыгады на чале з лепшымі ўдарнікамі-брыгадзірамі, якія з'яўляюцца адказнымі за выхад па снегабарацьбу па патрабаванню дарожнага майстра.

Палітаддзел Гомельскага чыгуначнага раёна, начальнікі дыстанцый шляха і дарожныя майстры прынялі на сябе абавязацельства: растлумачыць усім калгаснікам умовы аплаты і акуратна выплачваць за праведзеную работу; забяспечыць усіх працуючых па снегабарацьбе цёплымі памяшканнямі, гарачай ежай і кіпяткам нарэшце са штатнымі рабочымі; наладзіць культбытавое абслугоўванне ў бараках і казармах. Месца яўкі калгаснікаў па снегабарацьбу абавязаны паведамляць калгасам і брыгадзірам дарожныя майстры і начальнікі дыстанцый.

Заключаны дагавор рашана шырока абмеркаваць па сходах рабочых, ІТР дыстанцый шляха, на партыйных, комсамольскіх і прафсаюзных сходах, а таксама на пашыраных пленумах сельсоветаў і сходах калгаснікаў.

На аснове гэтага агульнага дагавора павінны быць раскрацаваны зусім канкрэтныя дагаворы па раёнах, МТС і калгасах. Для разгортвання шырокай масавай работы вакол гэтай кампаніі на месцы выяўляюць брыгады палітаддзела чыгуначнага раёна, работнікі дыстанцый шляха, райкомаў партыі, РВК і палітаддзелаў МТС.

Самае галоўнае — практычна рэалізаваць дагаворы. Іменна гэта будзе выклікаць сапраўдныя адносіны тэрытарыяльных арганізацый да дзяржтыў партыі аб дапамозе транспарту.

Р. ДОДЗІН.

Абаронім кожны кілометр пуці ад снега

ВІЦЕБСК.

Улічваючы надзвычай вялікую важнасць аказання свячасовай дапамогі чыгунцы ў яе барацьбе са снежнымі заямі, палітаддзел ВІЦЕБСКАЙ МТС падтрымлівае ініцыятыву палітаддзела ЛАЗОЎСКАЙ МТС (Украіна) і ДРЫСЕНСКАЙ МТС (БССР), якія ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па арганізацыі дапамогі чыгуначнікам у наладжванні снегабарацьбы.

Палітаддзел ВІЦЕБСКАЙ МТС для дапамогі чыгунцы прымацоўвае наступныя калгасы, прылягаючыя да Віцебскага вузла:

У ПОЛАЦКІМ напрамку ад станцыі ВІЦЕБСК да станцыі КНЯЖЫЦА — калгасы «БОЛЬШЗВІК», «1 МАЯ», «ШЛЯХ ДА СОЦЫЯЛІЗМА», ІМЯ ЯКАЎЛЕВА, «НАЙЕР ЛЕБН» і ІМЯ ЧАРВЯКОВА, ВІЦЕБСКАГА сельсавета.

Ад станцыі КНЯЖЫЦА да платформы СВЯНЦІЦКАГА — калгасы «ПЕРАМОГА», «МОЛАТ» і «ЗАХОДНЯЯ ДЗВІНА», ВЯЛІКА-ЛЁТЧАНСКАГА сельсавета.

У ЛЕНІНГРАДСКІМ напрамку ад станцыі ВІЦЕБСК да станцыі ЛОСВІДА — калгасы «ІСКРА», «ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ», «ПРЫЗЫЎ» і ІМЯ ЛЕНІНА, БАРАЎЛЯНСКАГА сельсавета.

Ад станцыі ВІЦЕБСК у СМАЛЕНСКІМ напрамку — калгасы ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, «1 МАЯ», ІМЯ БУДЗЕННАГА, «ЗВІЗДА», ІМЯ ЛЕНІНА, ІМЯ КАРЛА МАРКСА», ІМЯ КАЛІНІНА і «ЧЫРВОНЫ ЧЫГУНАЧНІК», СЯЛЮЦКАГА сельсавета.

Мы бярэм на сябе абавязацельствы разгарнуць у гэтых калгасах палітычна-масавую работу для мабілізацыі калгаснікаў і арганізацыі соцспаборніцтва паміж калгасамі на лепшую дапамогу чыгунцы ў зімовы перыяд.

У парадку падрыхтоўкі да 3 раённага злёта калгаснікаў-ударнікаў, які адбудзецца 28 лістапада, дабіцца, шляхам разгортвання палітмасавай работы, заключэння канкрэтных дагавораў паміж прымацаванымі да чыгуначных участкаў калгасамі і чыгункай, уцягнуўшы кожнага калгасніка ў актыўную дапамогу транспарту ў снегабарацьбе.

Намі пасланы на месцы сакратарам калгасных партыйных і комсамольскіх ячэек лісты з канкрэтным указаннем форм і метадаў разгортвання масавай работы ўнутры калгасаў, у брыгадах і групах.

Работу па дапамозе чыгунцы разгортваем пад такім лозунгам:

«НА АБАРОНУ КОЖНАГА КІЛАМЕТРА ПУЦІ АД СНЕГА ВЫЛУЧЫМ УДАРНУЮ БРЫГАДУ КАЛГАСНІКАЎ».

У кожным калгасе вострае стаіць пытанне з рамонтам сельгасінвентара. Мы лічым, што чыгуначныя арганізацыі ў парадку сацыялістычнай узаемадапамогі павінны арганізаваць дапамогу калгасам у рамонце інвентара.

На першае выказванне ўзятых абавязацельстваў па дапамозе транспарту ВЫКЛІКАЕМ НА СОЦСПАБОРНІЦТВА ПАЛІТАДДЗЕЛ АРШАНСКАЙ МТС.

Нач. палітаддзела Віцебскай МТС ВОЛКАЎ.

Нам. нач. палітаддзела МІХЕЙЧЫК.

Справы соцстрахаўскія...

Вось ужо 2 месяцы, як футкцыі соцыяльнага страхавання перададзены прафсаюзам. Час зусім выстарчальны для асваення гэтай справы. Тым больш, што ініцыятары вешнят у соцыяльным страхаванні прафсаюзы накапілі да ініцыя з органамі Наркампрацы і соцстраха. 11 галінавых кас, створаных задоўга да ініцыя пастановай ЦК УсеКП(б) і V пленума УсеЦСПС, значна наблізілі пытанне соцстраха да прафсаюзаў.

Аднак, да сённяшняга дня большасць цэнтральных праўленняў прафсаюзаў БССР не падышла шчыльна да пытанняў соцстраха, не праўляе высартачальнай ініцыятывы аб бесперабойным абслугоўванні застрахаваных.

У чым асновы недахоп работы прафсаюзаў БССР? Асновны недахоп у тым, што прафсаюзы вельмі вызначную увагу надаюць **спагнанню страхавых узносаў**, ад якіх цалкам залежыць фінансаванне ініцыятызаваных мерапрыемстваў: жыллёвага будаўніцтва, медпадапамогі, пенсіявання, прафілактыкі, дзіцячых устаноў і г. д.

План паступлення страхавых узносаў на 22 лістапада выканан толькі на 65 проц. Галінавыя касы прафсаюзаў недаатрымалі ад ініцыя **4 млн. руб.**, не лічачы **3 млн. руб.** запазычанасці, перадзенай старымі тэрытарыяльнымі касамі (напрыклад, на саюзах жыллёвагадоўчых і земляробчых соўгасаў запазычанасць пагнаецца з 1932 года і складае на першым — 240 тыс. руб., па-другім — 147 тыс. руб.

Вельмі кепска ідзе паступленне узносаў па ЦП саюза **папернікаў** (адказны сакратар т. **Харын**), якое атрымала на сённяшні дзень толькі 29,5 процантаў узносаў, перавяло ў ЦК саюза 15,6 проц., а ЦСПСВ на цэнтралізаваныя мерапрыемствы—ні адной капейкі. Кепска працуе ЦП саюза **гарадскіх прадпрыемстваў** (старшыня ЦП т. **Агол**), якое сабрала 45,6 проц., узносаў, перавяло ў ЦК саюза 58,9 проц., і ЦСПСВ —нічога. Не лепш працуюць ЦП саюзаў **мукамолеў** (старшыня ЦП т. **Курыцкая**), ЦП саюза **сельпром** (старшыня ЦП т. **Цімошкін**), ЦП саюза **даршасбуд** (старшыня ЦП т. **Гольдін**), ЦП саюза (старшыня

саюзаў толькі два—**керамікі і прамкам жыльбудаўніцтва**—аддаюць сацстраху па трэбную ўвагу і таму выканалі прыбыткоўю частку плана страхавых бюджэтаў.

У сувязі з недаатрыманнем значнай сумы ЦСПСВ, які фінансуе цэнтралізаваныя мерапрыемствы соцыяльнага страхавання, з вялікімі цяжкасцямі атрымаў да 20 лістапада крыху больш мільёна рублёў замест 2.767 тыс. рублёў. Ад атрымаванага мільёна не засталося ні капейкі, а на бліжэйшыя асігнаванні трэба мець не менш 1.200 тыс. руб.

Як відаць, становішча вельмі напружанае. Якія-ж меры прымаюць ЦП саюзаў для опанавання запазычанасці па страхувносах?

Значная частка ЦП (грамадскага харчавання, камунальнікаў, друкароў і інш.) спадзяецца выключна на самацён. Другая частка ідзе па лініі найменшага супраціўлення. Як вядома, цэнтральныя праўленні саюзаў атрымалі права накладваць арышт на бягучы рахунак тых прадпрыемстваў і ўстаноў, якія несвячасова пакрываюць запазычанасць па страхавых узносах. Гэтым правам шырока карыстаюцца ЦП саюзаў дрэваапрацоўшчыкаў, МТС, земляробчых соўгасаў, лесасплава і інш. Напрыклад, ЦП саюза земляробчых соўгасаў накласці арышт на бягучы рахунак **117 прадпрыемстваў** з агульнай колькасці — 153. ЦП саюза МТС «арыштавала» бягучы рахунак 22 прадпрыемстваў. ЦП саюза дрэваапрацоўшчыкаў накласла 7 арыштаў у тым ліку на бягучыя рахункі такіх буйных прадпрыемстваў, як бабруйскі і гомельскі камбінаты, лесазавод № 13 у Віцебску, камбінат «Комінтэрн» у Барысаве і інш. Мы добра ведаем, што азначае арышт бягучага рахунка прадпрыемства. Гэта азначае, што прадпрыемства на працягу пэўнага часу пазбаўляецца ўсякіх магчымасцяй атрымліваць грошы з банка, што, зразумела, часта дэзарганізуе ўсю работу прадпрыемства. Зразумела, ніхто не можа супярэчыць супроць арышта бягучага рахунка **злоснага** неплацельшчыка страхавых узносаў. Але ні ў якім разе чэлага згадзіцца з метадамі **масавага, агульнага** накладвання арышта на бягучы рахунак прадпрыемстваў без ўзвышання папярэдніх, чыста прафсаюзных метадаў уздзейнасці.

Аналізуючы метады работы прафсаюзаў на гэтым новым важнейшым участку прафсаюзнай работы — на ўчастку соцыяльнага страхавання, прыходзіцца зрабіць вывад, што і тут прафсаюзы не адмовіліся ад **бюракратызма і камандавання** і забыліся аб сваіх **асноўных абавязках: аб канкрэтным кіраўніцтве фабзаўкомамі, сістэматычным інструктажы прафактыва і арганізацыі кантроля страхавых долегатаў у справе соцыяльнага страхавання.** Вышэй прыведзены два адзіныя метады работы — **самацён або арышты** — кажуць аб тым, што большасць ЦП саюзаў не навучылася спалучаць **аперацыйнае кіраўніцтва і масавую работу з адміністрацыйным націскам.**

Вось факты. Старшыня заўкома **віцебскага пасасавода № 13** тав. **Клубнікаў** паверыў на слова бухгалтару канторы, што запазычанасць па страхувносах ліквідавана. На справе запазычанасць на 15 лістапада складала 10 тыс. руб. Старшыня заўкома **бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната** тав. **Міндлін**, атрымаўшы ў бухгалтэрыі **копію** даручэння банку аб пераводзе страхуносаў, не праверыў, ці пераведзены тропы. Што-ж аказалася? Бухгалтар проста **ашукаў свой заўком.** Ён копію даручэння даў, а самога даручэння банку не пераслаў. У выніку запазычанасць у 50 тыс. руб. свячасова не была ліквідавана. Такая-ж гісторыя здарылася на барысаўскім запалкавым камбінаце **«Пролетарская перамога».** Кантора дала даручэнне банку аб пераводзе страхуносаў, але потым перавод затрымала. А старшыня фабкома тав. **Фрэйндорф,** замест таго, каб разабраць і дагаварыцца з дырэктарам, пасылаў бухгалтэрыі «ультыматумы» папяркі. У выніку — 40-тысячная запазычанасць. Тое-ж самае была на **менскім дрэваапрацоўчым заводзе імя Молатава,** дзе бухгалтар **Віленскі** тры дні вадзіў заўком за нос, кажучы, што грошы перавёў, а на справе і не думаў іх раводзіць.

Што-ж зрабілі фабзаўкомы? Прыцягнулі бухгалтараў да судовай адказнасці? Стварылі паказальны працэс? Паставілі пытанне па абмеркаванне прафактыва і рабочай масы? Выключылі бухгалтараў з саюза? Арганізавалі кантроль страхад

АБМЕН ЛІСТАМІ ПАМІЖ М. М. ЛІТВІНАВЫМ І РУЗВЕЛЬТАМ

НЮ-ЮРК. (ТАСС). ПЕРАД АД'ЕЗДАМ З ВАШЫНГТОНА т. ЛІТВІНАЎ ЗВЯРНУЎСЯ ДА РУЗВЕЛЬТА З НАСТУПНЫМ ЛІСТОМ:

«МОЙ ДАРАГІ ПАН РУЗВЕЛЬТ! ПАКІДАЮЧЫ ПАЗІШ, Я ВЕЛЬМІ РАД ВЫКАЗАЦЬ ВАМ СВАЮ ВЫСОКУЮ ПАВАГУ І ПРЫЗНАЦЕЛЬНАСЦЬ ЗА ШМАТЛІКІЯ ПРАЯЎЛЕННІ ЎВАГІ І ПРЫЯЗНІ, ЯКІЯ ВЫ ВЫЯВІЛІ ЗА ЧАС МАЙГО ПРАБЫВАННЯ Ў ВАШЫНГТОНЕ.

АДНАЧАСОВА Я ВЫКАЗВАЮ СВАЮ ПРЫЗНАЦЕЛЬНАСЦЬ УСЯМУ ЎРАДУ І РОЗНЫМ ЯГО ОРГАНАМ ЗА ІХ ДАЛІКАТНАСЦЬ І КЛОПАТЫ. КАРЫСТАЮСЯ ВЫПАДКАМ ЗНОЎ ВЫКАЗАЦЬ МАЕ ЦВЕРДАЕ ПЕРАКАНАННЕ, ШТО ЎСТАНАЎЛЕННЕ АФІЦЫЯЛЬНАЙ СУВЯЗІ ПАМІЖ АБОДВУМА КРАІНАМІ ШЛЯХАМ АБМЕНА НОТАМІ ПАМІЖ ВАМІ І МНОЮ ПРЫНЯСЕ АБОДВУМ КРАІНАМ ВЯЛІКУЮ КАРЫСЦЬ, І БУДЗЕ САДЗЕЙНІЧАЦЬ УЗМАЦНЕННЮ І ЗАХАВАННЮ МІРА ПАМІЖ ДЗЯРЖАВАМІ, ДА ЧАГО ШЧЫРА ІМКНУЦЦА НАШЫ КРАІНЫ. Я ЎПЭЎНЕН, ШТО ІХ СУМЕСНЫЯ НАМАГАННІ ЎНЯСУЦЬ У ГАЛІНУ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН НОВЫ ТВОРЧЫ ФАКТАР, ЯКІ ПРЫНЯСЕ БЛАГА ЧАЛАВЕЦТВУ. ПРАШУ ВАС ПРЫНЯЦЬ, ДАРАГІ ПАН ПРЭЗІДЭНТ, МАЕ НАЙЛЕПШЫЯ ПАЖАДАННІ ВАМ, ВАШАЙ СЯМ'І І ВАШАЙ ВЯЛІКАЙ КРАІНЕ.

ШЧЫРА ВАШ

МАКСІМ ЛІТВІНАЎ».

РУЗВЕЛЬТ АДКАЗАЎ НАСТУПНАЕ:

«МОЙ ДАРАГІ ПАН ЛІТВІНАЎ! ДЗЯКУЮ ВАС ЗА ВАШ ДАЛІКАТНЫ ЛІСТ АД 22-ГА ЛІСТАПАДА. СУСТРЭЧА З ВАМІ ДАЛА МНЕ ВЯЛІКУЮ АСАБІСТУЮ ПРЫЕМНАСЦЬ І Я ВЕРУ, ШТО НАСТУПІЦЬ ДЗЕНЬ, КАЛІ Я ЗНОЎ БУДУ МЕЦЬ ПРЫЕМНАСЦЬ ВІТАЦЬ ВАС У АМЕРЫЦЫ. Я СПАДЗЯЮСЯ, ШТО ЗВЯРНУЎШЫСЯ Ў НАШУ КРАІНУ, ВЫ ПЕРАДАДЗІЦЕ ПРЭЗІДЭНТУ КАЛІНІНУ МАЕ ПРЫВІТАННЕ І НАЙЛЕПШЫЯ ПАЖАДАННІ. Я ГЛЫВОКА ЗАДАВОЛЕН ТЫМ, ШТО НАШЫ ГУТАРКІ ПРЫВЯЛІ ДА АДНАЎЛЕННЯ НАРМАЛЬНЫХ АДНОСІН ПАМІЖ НАШЫМІ НАРОДАМІ І ЎПЭЎНЕН, ШТО ГЭТЫЯ АДНОСІНЫ З КОЖНЫМ ГОДАМ БУДУЦЬ БОЛЬШ ЦЕСНЫМІ І БЛІЗКІМІ. СУПРАЦОЎНІЦТВА ПАМІЖ НАШЫМІ ЎРАДАМІ Ў ВЯЛІКАЙ СПРАВЕ ЗАХАВАННЯ МІРА ПАВІННА БЫЦЬ КРАЯВУГОЛЬНЫМ КАМНЕМ ДОЎГАЙ ДРУЖБЫ. МНЕ ЖАЛЬ, ШТО З ПРЫЧЫНЫ МАЕЙ АДСУТНАСЦІ Ў ВАШЫНГТОНЕ Я ПАЗБАЎЛЕН МАГЧЫМАСЦІ АСАБІСТА З ВАМІ РАЗВІТАЦЦА І ПАЖАДАЦЬ ВАМ ДОБРАЙ І ПРЫЕМНАЙ ДАРОГІ, АЛЕ ЗАПЭЎНЯЮ ВАС, ШТО З ВАМІ ЗАСТАЮЦЦА МАЕ НАЙЛЕПШЫЯ ПАЛКІЯ ПАЖАДАННІ.

ШЧЫРА ВАШ

ФРАНКЛІН РУЗВЕЛЬТ»

ЗАПРАШЭННЕ М. М. ЛІТВІНАВА Ў РЫМ

НЮ-ЮРК. (ТАСС).

Італьянскі ўрад праз свайго гасла Ў Вашынгтоне перадаў т. Літвінаву афіцыяльнае запрашэнне прыбыць у Рым у якасці госця італьянскага ўрада. Тав. Літвінаў прыняў запрашэнне. Сёння пасля паўдня ён выязджае з Нью-Йорка ў Італію на італьянскім параходзе «Коце дзі Савой».

НОВЫ ФРАНЦУСКІ ГАБІНЕТ

ПАРЫЖ, 26 лістапада (БЕЛТА).

Шатан сфармаваў урад з 18 міністраў. 12—радыкал-сацыялісты, у тым ліку прэм'ер і міністр унутраных спраў Шатан, міністр фінансаў Бонпэ, бюджэта Маршанд, ваенны Даладзе, морскі Арро, звіязцы Кот. Міністр замежных спраў Баўкур і гандлёвага флота Фро не належаць ні да якой групоўкі. Міністр асветы дэ-Монзі—член групы рэспубліканскіх сацыялістаў.

ДА СТВАРЭННЯ НОВАГА ФРАНЦУСКАГА УРАДА

ПАРЫЖ, 27 лістапада (БЕЛТА).

Амаль усе міністры габінета Шатана, апроч 4, уваходзілі ў склад габінета Сарро. Уключэнне ў габінет у якасці віцэ-прэм'ера і міністра юстыцыі Рэйнальдзі, прадстаўніка сенацкай права-цэнтрысцкай групы, узначальваемай Барту, сведчыць аб узмацненні тэндэнцыі да стварэння ўрада «правай канцэнтрацыі».

ГЕРМАНА-ПОЛЬСКАЯ ЭКСПАРТНАЯ ЗГОДА

ВАРШАВА, 27 лістапада (БЕЛТА).

Падпісан дагавор паміж Германіяй і Польшчай аб гандлі жытам. Дагавор устанаўлівае германа-польскае супрацоўніцтва ў экспарце жыта ў Скандынавію, Прыбалтыцкія краіны, у Бельгію і Галандыю. Карэспандэнт «Газета польска» паведамляе з Берліна, што з 1 мін. цнт. жыта, які мяркуецца прадаць на гэтых рынках у бягучым годзе, на долю Польшчы прыходзіцца 80 проц.

ПАСЛЯ АБВЯШЧЭННЯ «НЕЗАЛЕЖНАСЦІ» У ФУЦЗЯНЕ

НАНКІН РЫХТУЕЦЦА ДА ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯЎ

ШАНХАЙ, 25 лістапада. (БЕЛТА).

Паводле слоў амерыканскай газеты «Ньюс пост» у Фуцзяне ідзе двойная падрыхтоўка да адпраўкі ваеннай экспедыцыі на граніцы правінцыі Чжэцзянь.

Нанкін таксама канцэнтруе войскі на граніцы правінцый Чжэцзянь-Фуцзянь. Адкраўлена некалькі ваенных суднаў для блакады правінцыі Фуцзянь з мора.

У адказ фуцзянскія ўлады мінравалі бухту Амоя і Фучжоу. Гэтыя ваенныя падрыхтаванні суправаджаюцца ўзмоцненай прапагандай і спробамі Нанкіна, Кантона і Фуцзяна прыцягнуць на свой бок саюзнікаў.

ПАЗІЦЫЯ КАНТОНА

ШАНХАЙ, 25 лістапада. (БЕЛТА).

Пазіцыя Кантона ў адносінах правінцыі Фуцзянь астаецца нявызначанай. Згодна паведамленню агенцтва Рэйтэр, прадстаўнікі кантонскіх ваенных колаў заявілі, што Кантон не ўхваляе руху ў Фуцзяне, які вядзе да раскола, але не намеран пасылаць узброеныя сілы супроць паўстанцаў.

Кантонскія ваенныя лідэры паслалі фуцзянскім лідэрам тэлеграму, у якой указваецца, што, будучы згодны з любым рухам, накіраваным «супроць здрадніка», яны асуджаюць усякую спробу звяржэння гаміндаўскага рэжыма і спробу згоды з камуністамі.

РОСПУСК СІРЫЙСКАГА ПАРЛАМЕНТА

ПАРЫЖ, 25 лістапада (БЕЛТА).

Вярхоўны камісар Сірыі Мартэль аб'явіў аб роспуску парламента. Як паведамляе «Пці журналь», роспуск парламента выклікан апасеннем, што парламент адмовіцца ратыфікаваць франка-сірыйскі дагавор, ад якога, па водле слоў газеты, «залежыць лёс французскай палітыкі на Блізкім Усходзе».

МАСАВАЯ КАМПАНІЯ ВА ФРАНЦЫІ ЗА ВЫЗВАЛЕННЕ ТОРГЛЕРА, ДЗІМІТРАВА, ТАНЕВА І ПАПОВА

ПАРЫЖ, 25. (БЕЛТА).

Камітэт барацьбы за вызваленне Торглера, Дзімітрава, Папова і Танева пастанавіў арганізаваць з 1-га па 10-га снежня па ўсёй Францыі збор подпісаў пад петыцыяй з патрабаваннем вызвалення падсудных камуністаў.

Для арганізацыі петыцыі пастаноўлена стварыць па ўсёй краіне спецыяльныя камітэты.

СУТЫЧКІ КУБІНСКІХ РАБОЧЫХ З ЖАНДАРАМІ

НЮ-ЮРК. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Гаванны (Куба), у Камагуэйе 1.000 рабочых цукровага завода прабавалі выкаліць некалькі арыштаваных рабочых. Жандары разагналі рабочых. Забіта двое.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ Ў ЛАТВІІ

РЫГА. (БЕЛТА).

У сувязі з арыштам дэпутатаў рабоча-сялянскай фракцыі сойма, у Латвіі адбываюцца шматлікія арышты рабочых, падазраваемых у комуністычнай дзейнасці.

У Двінску агенты паліцыі стрэлам з рэвальвера забілі рабочага Вульфа Левіна, заклікаўшага рабочых пратэставаць супроць арышту рабоча-сялянскай фракцыі сойма.

РАСПРАВА КЛАСАВАЙ ЮСТЫЦЫІ

ЛОНДАН. (БЕЛТА).

Суд прыгаварыў комуністычную газету «Дэйлі уоркер» да ўплаты сакратару саюза транспартнікаў Бевіну 7 тыс. фунтаў стэрлінгаў у якасці кампенсацыі за «паклёп».

— Гэта рашэнне паказвае ўсім рабочым,—піша газета,—якой рызыцы падпадае рэвалюцыйная рабочая газета, калі крытыкуе рофармісцкіх лідэраў трэд-юніёнаў.

Газета заклікае рабочых падвоіць барацьбу за павялічэнне сроткаў газеты і за павышэнне яе тыража.

ВАКХАНАЛІЯ КАТАРЖНЫХ ПРЫГАВОРАЎ

БЕРЛІН, 26 лістапада. (БЕЛТА).

Гамбургскі надзвычайны суд прыгаварыў 26 рэвалюцыйных рабочых, абвінавачаных у сутычцы з нацыянал-сацыялістамі ў лютым г. г., да розных тэрмінаў катаргі і турмы. Каменшчык Краузе і цеслер Вухерфенніг прыгавораны кожны да 15 год катаргі, рабочы-будаўнік Гольм — да 12 год катаргі і г. д.

У Брэмене быўшы рэдактар комуністычнай газеты «Брэменер арбейтэр цэйтунг» Бэнерт прыгаворан да 2 з паловай гадоў турмы. У яго пры арышце знайшлі некалькі комуністычных лістовак. У Гарцы 70 арыштаваных абвінавачваюцца «ў замаху на звяржэнне існуючага лада». У Данцыгу арыштавана 14 рабочых, абвінавачаных у распаўсюджанні нелегальных комуністычных лістовак.

Па СССР

ДЭЛЕГАЦЫЯ ЎДАРНІКАЎ БАЯВОЙ ПАДРЫХТОЎКІ Ў т. К. ВАРАШЫЛАВА

МАСКВА, 27 лістапада (БЕЛТА).

Раніцой 26-га лістапада т. Варашылаў прыняў дэлегацыю лепшых з лепшых малодшых камандзіраў Прыволжскай ваеннай акругі ў складзе ка мандзіра адзялення 100 стралковага палка т. Граужаніна, пам. камандзіра ўзвода 94 стралковага палка тав. Чыжыкава і камандзіра адзялення №-й часці т. Пысіна. Звяртаючыся да дэлегацыі, т. Варашылаў сказаў:

«Рад што маю магчымасць у вашай асобе падзякаваць лепшых малодшых камандзіраў—ударнікаў ПрыВО і праз вас перадаць маю гарачую падзяку ўсім камандзірам, партыйным арганізацыям і комсамолу ПрыВО.

Я ўпэўнен, што вы і надалей будзеце перадавымі ўдарнікамі ў перабробцы сябе, не толькі фізычнай, але і сацыялістычнай перабробцы свайго саз нання. Вы павінны быць ударнікамі, новымі сацыялістычнымі людзьмі і на вучобе ў часці, і ў штодзённым жыцці, у быту, з'яўляючыся ў асяроддзі акружаючых вас праваднікам сацыялістычнай культуры і культурнасці.

Помніце, што перабудаваць сябе, быць узорам культуры і культурнасці—справа надзвычай вялікая і вельмі для нас неабходная. Прыміце падарунак за вашу выдатную работу».

Пры гэтых словах т. Варашылаў перадаў кожнаму з малодшых камандзіраў імянныя залатыя гадзіннікі з надпісам: «Выдатнаму малодшаму камандзіру ПрыВО — Наркомваенмор 26-XI-33».

Адказваючы наркому, малодшыя камандзіры абавязаліся яшчэ больш умацаваць баявой падрыхтоўкі сваіх падраздзяленняў.

НАВУКОВАЯ СУВЯЗЬ З ТУРЦЫЯЙ

ЛЕНІНГРАД, 26. (БЕЛТА).

Агульны сход Акадэміі навук адгалосна зацвердзіў палажэнне аб новастворанай пры Акадэміі камісіі садзейнасці навуковым сувязям з Турэцкай рэспублікай.

Мэта камісіі — усямерна садзейнічаць супрацоўніцтву навукова-даследчых устаноў і паасобных вучоных СССР і Турэцкай рэспублікі.

XII ТЫРАЖ ПАЗЫКІ „ПЯЦІГОДКА ЗА 4 ГАДЫ"

ЮШКАР-ОЛА. (БЕЛТА).

25-га лістапада адкрыўся 12 тыраж пазыкі «Пяцігодка за 4 гады». На першым пасяджэнні разыграны аблігацыі процантнага выпуска 1960 выйгрышаў па 382.400 руб.

Выйгрышы ў 1000 руб. палі на аблігацыі: серыя № 67.968, аблігацыя № 8,—87.895—№ 8,—26.938—№ 9.

АСВАЕННЕ ВЫТВОРЧАСЦІ НАВЕЙШЫХ МЕДЫЦЫНСКІХ ПРЫЛАД

ХАРКАЎ, 26 лістапада (БЕЛТА).

Усеукраінскі інстытут офтальмалогіі (вочных захворванняў) укершыню ў СССР зрабіў у сваёй эксперыментальнай лабараторыі рад навейшых медыцынскіх прылад і інструментаў: біаку лярную лупу, электрычны офтальмаскоп, хірургічны пінцэт Эльшынга і інш.

Імпарт гэтых прылад, маючых вялікую карысць для ўжыцця новых метадаў лячэння, абходзіцца дзяржаве каля 500 тыс. руб. золатам.

НЕАПУБЛІКАВАНЫЯ ТВОРЫ ПУШКІНА

ЛЕНІНГРАД, 25. (БЕЛТА).

Усесаюзным літаратурным музеем набыты ў Белградзе спыткав з 48 старонак вершаў Пушкіна. Гэтыя творы паэта адносяцца да 1825-26 года. Частка знойдзеных вершаў яшчэ не была апублікавана. Яны ўпершыню з'явяцца ў пушкінскім нумары маскоўскага журнала «Літературное наследство». Спытак паступіць на захаванне ў маскоўскі літаратурны музей.

НАВУКОВАЯ ЗАГАДКА СТАЛА ЯСНАЙ

ТАШКЕНТ, 26 лістапада (БЕЛТА).

У Каганскім раёне (Узбекістан) пры буданічных работах выяўлен алебастр, які ў злучэнні з звычайнай глінай дае пры высыханні цэмент выключнай моцнасці, больш высокай, чым у портланд-цемента.

Гэтым раскрыт сакрэт будаўнікоў бухарскіх мечэцей і іншых будынкаў Сярэдняй Азіі. Да гэтага часу склад цэмента, пры дапамозе якога будаваліся гэтыя будынкі, быў навуковай загадкай. Адкрыццё мае вялікае навуковае практычнае значэнне.

ЗАВОД ПА ВЫПУСКУ МАГУТНЫХ МОТАВОЗАЎ

КАЛУГА. (БЕЛТА).

У пачатку лістапада калужскі завод НКПС выпусціў першы магутны 300-сільны мотавоз.

НКПС пераўтворыць рэканструяваць завод для арганізацыі на ім масавага выпуска такіх мотавозаў. На рэканструкцыю яго адпускаецца 43 млн. руб.

Пасля поўнай рэканструкцыі гадавая праграма завода складзе 100 млн. руб., у той час, як за першую пяцігодку ён даў прадукцыі ўсяго на 41 млн. руб.

УСЕСАЮЗНАЕ ГОРНА-ЛЫЖНАЕ СВЯТА

СВЯРДЛОЎСК. (БЕЛТА).

Каля Свярдлоўска падрыхтоўваецца пляцоўка для Усесаюзнага горна-лыжнага свята.

Будуецца магутны трамплін, на якім будзе разыграна пярэшнства РСФСР і Саюза па лыжах. Фізкультурнікі Перміі, рыхтуючыся да Усесаюзнага свята, арганізуюць масавы парад лыжнікаў, у якім будзе прымаць удзел да 7 тыс. чалавек.

ГЕРА'ЗМ МЕХАНІКА ДАРОХІНА

АЛМА-АТА, 25 лістапада. (БЕЛТА).

На цеплаходзе «Красный Таджикистан» у часе рэйса па Аральскаму моры стварылася цеч у карпавой часткі, пагражаўшая гібеллю судна. Удар нік-механік тав. Дарохін з рызыкай для жыцця, пераўтворыўшы ў ледзяную ваду ўстанавіў месца цечы і выправіў пашкоджанне.

За геройскі ўчынак Дарохіну абвешчана падзяка і выдана прэмія.

Трамвай у рабочых акраінах

НА ЗДЫМКУ: вагон новай трамвайнай лініі (№№ 6 і 7), якая злучае цэнтр з рабочай акраінай — Кальварыяй. (Менск).

ПАПРАУКА

У змешчаным агладзе другу «На вышыні палітычных задач» (№ 261, 26-XI) па тэхнічным недагляде дапушчана прыкрая памылка.

У 3-м абзацы знізу першай калонкі надрукавана:

«У заключэнне газета робіць вывад, што пасля чысткі ячэйкі, калгас «Чырвоны лётнік» СТАНЕ БОЛЬШЭВІЦКІМ».

Трэба чытаць:

«У заключэнне газета робіць вывад, што пасля чысткі ячэйкі калгас «Чырвоны лётнік» стаў не большэвіцкім».

Рэспубліканская камісія па чысткі КП(б)Б паведамляе, што 29 лістапада, а 10 гадзіне раніцы (Дом урада, пракат а 10 гадзіне раніцы (Дом урада, пракат а 10 гадзіне раніцы, пакой 226), адбудзецца пасяджэнне Рэспубліканскай камісіі па разгляду апеляцый на рашэнні Менскай гарадской камісіі наступных таварышоў:

Зайчык Г. І., Ламака І. П., Логвінаў П. І., Гольдштэйн І. Р., Пашковіч І. Г., Галоўцік П. С., Поршнеў Е. П., Ледзіч С. М., Ліхачаў П. В., Малліна Р. Х., Гальперына І. К., Смірнова П. Л., Навіцкі С. С., Каплан І. М., Пасманік А. М., Хургель Г. С., Нойма Л. У., Ламака А. А., Отэрлін А. М., Хурсанаў К. А., Вальцэховіч М. К., Берковскі Ш. Г., Відэрман Я. І., Краснік Л. Ф., Шапіра М., Брэсман Х. Н., Цвайберг Э. Я., Хінэвіч В. А., Кукліў І. З., Карасік А. Ш., Турын Э. К., Борц М. Х., Лысковў І. Д., Мукасей Х. М., Пуліхаў П. П., Чурылін І. І., Арэхчоўскі В. М., Кандрашоў В. Н., Чэркаскі В. Н., Жыгалка Л. І.

Рэспубліканская камісія па чысткі КП(б)Б.

Менгарком КП(б)Б склікае 29 лістапада г. г. а 7-й г. увечары ў вялікай зале Дома комасветы агульна-гарадскую нараду партактыва.

Упарадку дня даклад дэлегацыі парторгаў аб вопытах партмасавай работы на прадпрыемствах Масквы

На нараду выклікаюцца ўсе сакратары партколектываў, сакратары пах ячэек, групарторгі, групагітатары ўсіх вытворчых, совецкіх і вузаўскіх партарганізацый.

Білеты атрымаць 28-га і 29-га лістапада ў ГК КП(б)Б (пакой № 45).

Менгарком КП(б)Б

Прамысловы сектар „Звязды" і Беларускае аддзяленне рэдакцыі „Лёгкая індустрыя" паведамляюць, што

НАРАДА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ РЭЙДА

па тэхнавучанню і ўкараненню значка „ЗОТ"

ПЕРАНОСІЦЦА на 29 лістапада, а 6 гадз. дня.

Наступныя прадпрыемствы вызначаюць па 5 чал. ударнікаў-рабкораў—удзельнікаў рэйда: „Большэвік", імя Варашылава, „Кастрычнік", „Комунар", „Комунарка", імя 8-га сакавіка, імя Крупскай, шпалерная фабрыка, абутковая фабрыка, завод імя Молатава, галантарэйная „Усход", галантарэйная імя Фрунзе і завод імя Мясніка.

Прам. сектар „Звязды"

„Лёгкая індустрыя"

Рэдакцыя газеты „Звязда" сумесна з Бел. аддзяленнем газеты „ЗКП" склікаюць нараду, на якой будзе абгаворана пытанне аб становішчы і задачах

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ Ў ШКОЛАХ

З дакладам выступіць начальнік школьнага кіраўніцтва Наркамасветы тав. ЛЕШЧЫНСКІ.

Прыняць удзел у нарадзе запрашаюцца загадчыкі 2-й, 4-й, 6-й, 8-й, 12-й, 13-й, 15-й, 20-й, 25-й, 28-й і 39-й школ ФЗС, настаўнікі-ударнікі, представнікі камсаюзу і піонер, важатыя гэтых школ, работнікі школьнага кіраўніцтва Наркамасветы, представнікі гарана і гаркома працасветы.

Нарада адбудзецца 23 лістапада а 7 гадз. увечары ў памяшканні сталовай рэдакцыі і друкарні «Звязды» (Совецкая, 63, уваход са двара).

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Беларускі Дзяржаўны тэатр Оперы і Балета (памяшканне БДТ—1)

Мастацкі кіраўнік, галоўны дырыжор—заслужаны артыст рэспублікі тав. Гітгарц І. А.

29 і 30 лістапада ОПЕРА „ЯЎГЕНІ АНЕГІН" муз ЧАЙКОЎСКАГА

Пастаноўка рэж. ОЛЬГІ БАРЫСЕВІЧ. Дырыжор Н. С. БАЛАЗОЎСКІ.

Пачатак роўна ў 8 гадз. веч.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР (вул. Валадарскага, 7, тэл. № 21-813)

1-га снежня

РЭКРУТ

Пастаноўка заслуж. артыста рэспублікі Ю. Ф. РАФАЛЬСКАГА.

Пачатак у 8 гадз. вечара.

Білеты, узятыя на 16-11, сапраўдны на сёння

ГУКАВЫ кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

ДЭКАДНІК ГУКАВОЙ ФІЛЬМЫ

Толькі 3 дні: 28, 29 і 30 лістапада

Вялікі гукавы мастацкі фільм

ГАЙЛЬ МОСКАУ (НЯХАЙ ЖЫВЕ МАСКВА)

У праграме: новая кіно-хроніка Саюзкіно.

Штодзенна 4 сеансы: пачатак у 6, 7-30 9, 110-30

У фойэ—аркестр. Каса—ад 1 г дня.

У карціне ДЖАЗ-БАНД Я. Спанаровага

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Замежны мастацкі фільм МІХАЭЛЬ Драма ў 7 частках

„СПАРТАК" Каса—з 4 г. дня. Замежны фільм БЕЛАЯ МОЛЬ

КІНО „Пролетарый" Замежны мастацкі фільм Цыганка Марцана (гішпанская танцаўшчыца)

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ кіно-тэатр Гукавы фільм КАРМЕЛЮК

Увазе работнікаў цэнтральных, гарадскіх, раённых, палітаддзельскіх, фабрычна-заводскіх і транспартных газет і рабселькораў БССР

АДКРЫТА ПАДПІСКА НА НОВЫ ДВУХТЫДНЁВЫ ЖУРНАЛ ЦК КП(б)Б

„БОЛЬШЭВІЦКІ ДРУК"

Журнал разлічан на партыйны актыў, работнікаў культпропаў, райкомаў і гаркомаў, цэнтральных, раённых, гарадскіх палітаддзельскіх, фабрычна-заводскіх і Транспартных газет БССР і рабселькораў-ударнікаў.

Задача журнала: кіраўніцтва друкам і дапамога ў рабоце газет, кіраўніцтва рабселькораўскім рухам.

Асноўны змест журнала: пытанні партыйнага кіраўніцтва друкам, агляды друку і распрацоўка розных пытанняў работы газет (формы і метады масавай работы газет, пытанні падрыхтоўкі кадраў, арганізацыя работы ўнутры рэдакцыі і г. г. д.)

Для рэдакцый раённых, фабрычна заводскіх, транспартных палітаддзельскіх газет рэдакцыяй журнала будзе выдавацца

спецыяльная ўкладка—прэс-бюлетэнь

артыкульных матэрыялаў для скарыстання газетамі Прэс бюлетэнь будзе выходзіць 6 раз у месяц.

ЗМЕСТ ПРЭС-БЮЛЕТЭНЯ:

а) Артыкулы, якія растлумачваюць важнейшыя пастановы ЦК УсенКП(б), ЦВ КП(б)Б С. Н. СССР, СНК БССР.

б) Прапагандысцкі матэрыял па вузлавых пытаннях палітыкі партыі, па пытаннях гісторыі, стратэгіі і тактыкі большэвізму.

в) Асноўныя матэрыялы для правядзення найбольш важных гістарычных дат і кампаній.

г) Артыкулы аб важнейшых падзеях міжнароднага жыцця, асаблівы, польшчы і Заходняй Беларусі.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На год—12 руб., На 6 мес.—6 руб., На 3 мес.—3 руб.

Падпісная плата за журнал разам з прэс-бюлетэнем: для раённых і транспартных газет—75 р.; для фабрычна-заводскіх і палітаддзельскіх—40 руб. у год.

Адрас рэдакцыі: Менск, Совецкая, 63.

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях БССР і ў лістаносцаў, АДРАС ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 63. Выдавецтва ЦК КП(б)Б „ЗВЯЗДА"

Ліквідком па справах Белкахотсаюза

даводзіць да ведама ўсіх кааператыўных і іншых грамадскіх гандлюючых арганізацый, што ў сувязі з ліквідацыяй праводзіцца па наступных цэнах

продаж наступных тавараў:

абутка, гатовага адзення, трыкатажа, паляўнічых, спартыўных, рыбалоўных і іншых наштоўных тавараў.

За даведкамі звяртацца да ліквідкома Белкахотсаюза па адрасу: г. Барысаў, Маскоўская вул. 26.

Менскі вячэрні архітэктурна-будаўнічы тэхнікум

абвяшчае набор

на 7-месячныя курсы

па падрыхтоўцы ў тэхнікум

На курсы прымаюцца асобы, працуючыя на будаўніцтве не менш 2-х год з адукацыяй 5 груп семігодкі.

Заявы прымаюцца да 1-га студзеня 1934 г. у канцылярыі тэхнікума па адрасу: Менск, вул. К. Маркса, 5.

Дырэкцыя.

29 лістапада г. г. а 8-й гадз. увечары ў памяшканні 2-ой ФЗД (Ленінская, 21)

склікаецца нарада

ўсіх загадчыкаў ФЗС, ФЗД, школьных дантароў, загадчыкаў дзіцячых дамоў, загадчыкаў дашкольных устаноў, загадчыкаў вячэрніх школ, старшынь школьных МК, загадчыкаў школьных сталовак, представнікоў ад ЦДД, таварыства ПД, ДКО, Чырвонага Крыжа, дзіцячага кіно, ТЮГ Гарздрава, санітарнай станцыі, ад лазні т. Марголін, загадчыкі клубаў і бібліятэк па пытаннях:

1) Аб саніміпімуме ў культасветных установах і барацьбе з зайдзіміні (Стальмашонак).

2) Аб ходзе вытворчага пахода імя т. Гікало (Бодэйна, Жайрыд).

Па гэтых-жа пытаннях 3 снежня 1933 г. а 12 гадз. дня ў памяшканні клуба Леніна (рог Урыцкага і Карла Маркса, уваход з вул. Урыцкага), склікаецца на нараду ўсіх загадчыкаў школ раёна (ШКМ і пачатковых), за адчыняў дашкольных устаноў раёна, дзіцячых дамоў, загадчыкаў ДСК, старшынь селькомаў.

Менгарвна і Гарком Саюза працасветы, Гарздрав.

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б (Партвыдат)

Новыя выданні:

Вышла з друку:

Паступіла ў продаж і рассылаецца на месцы

„КНІГАГАНДАЛЬ" ДВБ

І. СТАЛІН.— Аб асновах ленінізма. Стар. 72, тыр. 35.000, ц. 50 к., пер. 30 к.

Друкуецца

1 на днях паступіць у продаж

ЖАБРОЎСКІ В. Ю. (Сакратар ЦК КП(б)Б. За ўмацаванне парткіраўніцтва комсамолам.

ПАТРАБУЙЦЕ ва ўсіх кнігарнях і кіёсках ДВБ, БАКТ'а, Райсаюзаў і Саюздрука.

Ад журы па конкурсу на лепшы драматычны твор.

Даводзіцца да ведамы зацікаўленых асоб, што апошні тэрмін 15 снежня г. г. і што да гэтага тэрміна павінен быць представлен твор (надрукаваны на машынцы або начыстка перапісаны) па адрасу: Менск, Наркамасветы, кіраўніцтва мастацтва, журы конкурса СНК БССР.

Журы конкурса.

Стара-Барысаўскаму свінагадоўчаму тэхнікуму

ПАТРЭБНЫ НА СТАЛУЮ ПРАЦУ

1) выкладчык беларускай і рускай мовы і літаратуры,—нагрузка да 2-х ставак,

1 2) грамадавед.

Тэхнікум представляе кватэру і камунальныя паслугі.

Заявы накіроўваць па адрасу: г. Барысаў, Стара-Барысаўскі тэхнікум свінаводства.

Абавязковая пастанова № 25

Менскага гарадскога совета

21 лістапада 1933 года гор. Менск

З МЭТАЙ ПАЛЯПШЭННЯ САНІТАРНАГА СТАНА ГАРАДСКОГА ВАДАПРАВОДА, ЯКАСЦІ ВАДЫ І ПРАВЯДЗЕННЯ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ, ЯКІЯ ПАПЯРЭДЖВАЮЦЬ РАЗВІЦЦЁ ЭПІДЭМІЧНЫХ ЗАХВОРВАННЯЎ, ПРЭЗІДЫУМ ГАРСОВЕТА ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Устанавіць для скважын і студняў менскага гарадскога вадаправода зону строгага рэжыма і зону адмежавання.

У зону санітарнай аховы ўваходзяць крыніцы забеспячэння вадой, пабудовы, маючыя адносіны да вадаправода, вадаправод і ўся мяцоцвасць з воднымі крыніцамі і воднымі пабудовамі.

2. Зону строгага рэжыма ўстанавіць:

а) для скважын і студняў, якія знаходзяцца ва дварэ МГЭС у межах квартала МГЭС,

б) для скважын, якія знаходзяцца ў Навінках радыусам у 50 метраў, а для ўсіх скважын—паласой у 100 метраў,

в) для студняў, якія знаходзяцца на Барысаўскім тракце, радыусам у 10 метраў, а для скважын у гарадскім садзе—у 5 метраў.

3. Забараніць: а) у межах зоны строгага рэжыма ўсякае пражываванне, б) па будову будынкаў, не маючых непасрэдных адносін да вадаправода.

У крайніх выпадках дапусціць пражываванне служачых і рабочых вадаправода.

4. Закрыць паглынаючыя студні ў межах зоны строгага рэжыма. Выпрабаваць уборныя, памыйныя ямы, арабіць вадапрапускаемымі і тэрыторыю зоны абгарадзіць.

5. Устанавіць зону адмежавання:

Для скважын і студняў, якія знаходзяцца ва дварэ МГЭС у межах наступнага ўчастка: ад маста па Пролетарскай вул. праз Першамайскі мост, сад «Прафінтэрн», 2-гі завулак Шпітальнай, Чырвонасцяжная і Пролетарскай вул. да маста.

Для скважын, якія знаходзяцца ў Навінках, арыентыравана ў наступных межах:

а) На поўначы: мяжа праходзіць праз наступныя населеныя пункты: Галубаева, Забалацце, Ляскоўка.

б) На поўдні: Малое Сціклева, соўгас Слепня і ў межах горада: Цяпінская вул., Бугачоўская, Крапоткіна вул., ад Камароўскай да могілак, Стараміенскі тракт да маста канала балотнай станцыі і далей—пасёлак Магуляніка на захадзе.

в) На ўсходзе: Ляскоўка, ур. Сухаруцкія, Малое Сціклева.

г) На захадзе ад Магуляніці да Галубаева.

Для студняў, якія знаходзяцца на Барысаўскім тракце, устанавіць зону ад межавання ½ кілометра.

6. Забараніць у межах адмежавання пабудову прадпрыемстваў, сточныя воды якіх могуць забруднець грунтавыя воды. Існуючыя паглынальныя студні закрыць да 1 кастрычніка 1934 г. (пачынаючы ад крыніц вадазабеспячэння).

7. Усе праекты і планы работ у межах зоны павінны зацвярджацца санітарнай арганізацыяй. Работы па правядзенню бурыльных і капальных студняў, глыбінёй больш 20 метраў, і ўсякія земельныя работы, звязаныя з выемкай грунта, павінны праводзіцца па спецыяльнаму дазволу санітарнага нагляда.

Абавязаць санстанцыю ўстанавіць рэгулярны нагляд і лабараторны кантроль за ўсякімі стокамі ў вадаёмы.

8. Выкананне ўсіх работ, звязаных з устанаўленнем зоны строгага рэжыма, ускласці на вадаканалізацыю, а выкананне работ, звязаных з устанаўленнем зоны адмежавання, ускласці на камгас і адпаведныя дома ўладанні.

9. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскласці на санстанцыю.

10. Асобы, вінаватыя ў незыканаванні гэтай пастановы, падлягаюць ад